

ХТО СТАЎ «КАРАЛЕВАЙ СТУДЭНЦТВА 2022»? ЧЫРВОНКА

ЖЫЦЦЁ І БЛОГ СА СМАКАМ МЁДУ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 111 (29733)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Распрацоўка айчыннай вакцыны ад COVID-19 ідзе паводле графіка, да 2023 года плануем зарэгістраваць беларускую вакцыну. Прыйдзецца яе выпускаць масава ці не, пытанне часу. Але мы павінны быць у поўнай меры гатовы да любой эпідэміі. Асноўная задача — пабудаваць у Віцебску завод інактываваных вакцын. З'явіцца платформа, на аснове якой можна выпускаць прэпараты супраць любой інфекцыі. Там жа арганізуем правядзенне комплексу даклінічных і клінічных даследаванняў — тое, чаго ніколі не было ў Беларусі. Адкрыецца найшырэйшая палітра магчымасцяў, зможам іх выкарыстоўваць».*

# Знаўца швейных спраў



У Аршанскім дзяржаўным політэхнічным прафесійна-тэхнічным каледжы захоўваецца ўнікальная калекцыя швейных машын. Дзякуючы шматгадовым пошукам яе сабраў і захаваў майстар вытворчага навучання Віктар ГАРАЎЦОЎ. У аўдыторыі-майстэрні, дзе праходзяць практыку будучыя наладчыкі швейнага абсталявання, выстаўлены сапраўдныя рарытэты вядомых брэндаў — ад амерыканскага «Зінгера» да рускага «Падольска» і беларускай «Оршы», з якімі не толькі знаёмяцца, але і спрабуюць на іх шыць, хоць некаторым з гэтых рарытэтаў пад сотню і нават болей гадоў. Напрыклад, у гэтай калекцыі ёсць адзін экзэмпляр з 1896 года — маркі «Зінгер» і першыя машынкі роднага завода. Віктар Леанідавіч, які болей за чвэрць стагоддзя адпрацаваў у канструктарскім бюро Аршанскага «Легмаша», ведае цану гэтай калекцыі і спадзяецца на станоўчае рашэнне гарадскіх улад стварыць у Оршы музей швейнай машынкі (прычым першы ў краіне). «Вядомы калісьці ва ўсім Саюзе завод ужо на існуе, але памяць пра яго і яго славутую прадукцыю павінна застацца для будучых пакаленняў, — зазначае апантаны аршанец.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **МТЗ прадставіў беспілотны трактар на «Белагра».**



- Беларусь і Чувашыя плануюць абменьвацца вопытам у рэалізацыі лічбавых праектаў.
- **«Вёскі будучыні» і эканамічныя стымулы: у Беларусі распрацавалі канцэпцыю рэгіянальнага развіцця.**
- Беларусь і Расія будуць сумесна развіваць скачкі з трампліна і лыжнае дваяборʼе.
- **Электронная энцыклапедыя «Магілёў на Дняпры» раскажа пра 250-гадовую гісторыю краю.**

Паўднёвы полюс Зямлі

**Аляксей ГАЙДАШОЎ:**

## «Конкурс у экспедыцыю — 4-5 чалавек на месца»



**6 чэрвеня ў 9 гадзін раніцы ў раёне размяшчэння Беларускай антарктычнай станцыі каля гары Вячэрняя было мінус 27 градусаў, вільготнасць паветра — 45 працэнтаў, хуткасць ветру складала 19 метраў за секунду з максімальнымі парывамі — да 24 метраў за секунду... Гэту інфармацыю паведаміў начальнік 14-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ падчас сустрэчы з кіраўніцтвам Нацыянальнай акадэміі навук. Урачыстыя провады і сустрэча беларускіх палярнікаў у сценах Акадэміі даўно сталі добрай традыцыяй.**

СТАР. 4

Летнія канікулы

## КАМУ АДПАЧЫВАЦЬ, А КАМУ — ПРАЦАВАЦЬ

### Якія гарантыі маюць непаўналетнія ўладкоўваючыся на часовую працу?

**У бягучым годзе плануецца часова працаўладкаваць 25 тысяч навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў і школьнікаў. Для юнакоў і дзяўчат гэта магчымасць атрымаць у вольны ад вучобы час уласны заробак. Не супраць працаўладкавання і многія бацькі: няхай падлетак нарэшце адчуе цану зробленых грошай. Хто мае прыярытэтнае права на працаўладкаванне? Ці можа наймальнік прызначаць выпрабавальны перыяд непаўналетняму работніку і ці трэба працаваць цэлы дзень? Ці можна звольніць такога работніка? Пра гэтыя і іншыя нюансы расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Менавіта гэта ведамства сумесна з аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам праводзяць работу па арганізацыі часовай занятасці моладзі і забяспечваюць магчымасць непаўналетнім працаваць, пачынаючы з 14 гадоў. Мерапрыемствы па арганізацыі занятасці непаўналетніх і неабходныя для гэтага фінансавыя рэсурсы ўключаны ў дзяржпраграму «Рынак працы і садзейнічанне занятасці на 2021—2025 гады».

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

# «УСЕ ЗАПЛАНАВАНЫЯ САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ ВЫКАНАНЫ»

## Дэпутаты працуюць над справаздачай аб рэспубліканскім бюджэце 2021 года



pixabay.com/

**Усе запланаваныя сацыяльныя гарантыі грамадзян, згодна з бюджэтам, летась выкананы, як і планавалася. Пра гэта журналістам расказала старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла НІЖЭВІЧ напярэдадні пашыранага пасяджэння камісіі. На сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў Савета Рэспублікі, Мінфіна, КДК і Мінпрацы дэпутаты разгледзелі праекты законаў аб выкананні дзяржаўнага бюджэту і аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2021 год.**

«Мне хацелася б адзначыць асаблівасці выканання рэспубліканскага бюджэту 2021 года. Перадусім, на працягу года ў сувязі са станоўчай дынамікай развіцця эканомікі ВУП выканана на 102,3 працэнта. Добрыя былі паказчыкі па экспарце — больш чым 136 працэнтаў. Гэтыя фактары і сусветная кан'юнктура коштаў на сыravіну паўплывалі на выкананне прыбытковай часткі», — сказала дэпутат.

Па яе словах, у рэспубліканскі бюджэт дадаткова паступіла на працягу года 4,2 мільярда рублёў. Гэта дазволіла выканаць неабходныя расходы, іх удакладніць на 2,5 мільярда і скараціць дэфіцыт бюджэту ў 4 мільярды.

«Па фактычным выкананні мы выйшлі на лічбу ў адзін мільярд рублёў. Больш паступіла падатку на прыбытак — у 2,8 раза. Больш паступіла падатку на дабаўленую вартасць. Падатковыя паступленні склалі каля 84 працэнтаў даходаў бюджэту», — дадала Людміла Ніжэвіч.

Яна падкрэсліла, што ў цэлым даходы рэспубліканскага бюджэту склалі 27,9 мільярда рублёў, расходы — 28,9. «Даходы перавыкананы на 1,5 працэнта да плана, расходы на 97 працэнтаў. Усе запланаваныя сацыяльныя гарантыі, усе пытанні сацыяльнага забеспячэння грамадзян выкананы, як і планавалася. На працягу года стварaўся рэзервовы фонд, які выкарыстоўваўся на павышэнне заробкаў, выплату надбавак працаўнікам аховы здароўя ва ўмовах ковіду», — канстатавала парламентарый.

Людміла Ніжэвіч назвала мінулы год станоўчым для фарміравання бюджэту.

«Аб'ём расходаў на фінансаванне сацыяльнай сферы павялічыўся амаль на 12 працэнтаў па ўсіх кірунках. Прафінансавана ў суме 5,7 мільярда рублёў, або 20 працэнтаў, рэспубліканскага бюджэту. Іншымі словамі, рэальны рост даходаў склаўся і пры інфляцыі 9,5 працэнта — гэта добры паказчык для нашай эканомікі. Мінулы год быў станоўчым для фарміравання бюджэту», — адзначыла дэпутат.

Расходы бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў 2021 годзе склалі 19,2 мільярда рублёў. Найбольшую ўдзельную вагу ў расходах бюджэту фонду складаюць выдаткі на выплату пенсій (76 працэнтаў) і дапамог (22,6 працэнта). Фінансаванне ўсіх неабходных расходаў за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў 2021 годзе забяспечана своечасова і ў поўным аб'ёме. Такім чынам, за 2021 год бюджэт фонду выкананы па даходах у суме 19,6 мільярда рублёў і па расходах у суме 19,2 мільярда рублёў з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме 361 мільён рублёў.

Як паведаміла суразмоўца, праекты законаў пасля пасяджэння камісіі будуць вынесены да разгляду ў Авальнай зале 16 чэрвеня.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Па сутнасці

# ПЕРАМОЖНАЯ ПРАЎДА



**Ну што, аб прапагандзе? Прабачце, маю права. Я праўдзіва і без пазёрства голасна заяўляў: «У эфіры — прапагандыст». Дарэчы, тады гэтым словам, нібы таўшчэзным цвіком, прыбівалі да ганебнага слупа ўсё праўдзівае, але тое, што не пасавала неверагоднай філасофіі палітычнага абардажу. Тэрмін гэты лічылі абразлівым, брудным, запэцканым. Так, гучыць ён як вершы Маякоўскага: слова — і кропка. «ПРАПАГАНДА».**

Але, прабачце, па стаўленні да самага тэрміна можна ўжо зразумець і светапогляд чалавека. Ну, даруйце мне. Але ж пасля тэлевізійнай экспансіі «мыльных» гісторый і шоу далёка не найвышэйшага гатунку, пасля Telegram, TikTok, у якім «заліпаюць» да ночы, пакуль не сліпнуцца вочы, нават мужчыны са стальнымі мускуламі і да непрыстойнасці дагледжанай барадой. Пасля такіх «пэрамэн» у нашым інфармацыйным меню людзі думаюць, што шмат чаго ведаюць, і нічога не разумеюць. Такая вось інфармацыйная парадлівасць. Маўляў, я ведаю ўсё, бо я падпісчык тэлеграм-каналаў. Дык вось калі б вы хоць бы ведалі сапраўднае значэнне слова «прапаганда», то, мабыць, не ператкваралі свой розум у жабрака з дзіравай торбай.

Тэрмін той родам не з савецкіх брашур ЦК, а, як і шмат важкіх слоў, з латыні — мовы навукі. А вось само паняцце ўжо прысутнічала ў законах Хамурапі. І выкарыстоўваць прапаганду не грэбавалі каталіцкія пілігрымы. Сэнс звычайны — распаўсюджванне. Вось з такога распаўсюджвання кадраў з Месяца і пачыналася зоркава-паласатая гегемонія. І пакуль савецкія рэжысёры займаліся стварэннем сапраўднага кіно, Галівуд распаўсюджваў «вялікую амерыканскую ідэю». Прапаганду свайго погляду на жыццё. Памятаеце, як у 1990-я шмат людзей збіралі каля экранаў баевікі, у якіх свет заўжды выратоўваў амерыканскі прэзідэнт, спецагент альбо фермер з Аклахомы. А падчас перапынку рэклама агітавала за адзенне, ежу, нават манеру трымацца па-заходняму. Ну, адкажыце: калі сярод нашых звычак было прынята задзіраць ногі вышэй... падлогі. Пра польку не кажу. Вось вам і сапраўдная прапаганда.

Але ж чамусьці ўсё добрае — з мінулага: паважаць старэйшых, добра вучыцца альбо самааддана працаваць, ганарыцца сваімі Ягоравым і Кантарыяй ці стаханаўцамі, перамогамі ці будоўлямі стагоддзя, нарэшце Гагарыным. Усё гэта было абвешчана прапагандай і манояй. Замест сапраўднага і велічнага — нізкасортнае і пахабнае. Заходнія прапагандысты не толькі займаліся ПРАПАГАНДАЙ свайго. Але яшчэ і ўсё вынішчалі наша. Добрае і светлае. Сапраўднае і пераможнае. І ўсё гэта з пагардай называлі «прапагандай». А сваю ману і хлусню — адкрытасцю і галоснасцю. У заходняй дэмакратыі два крылы. Вы думаеце — адкрытасць і галоснасць? Не. Два крылы бамбардзіроўшчыкаў F-35.

Адбывалася вестэрніфікацыя нашага грамадства. Ну, напрыклад, замест Зоі Касмадзям'янскай — іконы разбэшчанага стылю, «прыгажуні» мадоннага фармату. У 1990-я нарадзіліся фэйкі. Гістарычныя. У чым іх моц? У тым, што на нейкі факт нанізваюць усё, што ім даспадобы. Бо, як вядома, нават самую чыстую ваду сапсуе некалькі капель бруднай. Ну, напрыклад, два самыя першыя і агідныя фэйкі. Першы — пра тое, як савецкія войскі хацелі напасці на Гітлера. Другі, маўляў, калі б нацысты заваявалі СССР, то зараз мы бы жылі ў квітнеючай Германіі. І гэтую гумку, нібы дзеці 1990-х, адзін аднаму перадавалі нават актыўныя камуністы. Пакт Молатава і Рыбентропа быў. А як па-іншаму? Калі супраць СССР тады паўстала ўся Еўропа. А астатняе? Астатняе вам не напісалі. І пра жаданне Пілсудскага быць у долі, пра тайныя перагаворы розных кіраўнікоў з жудасным рэйхканцлерам. А вы думаеце, цяпер іншае? Не.

Цяпер пра самы дурны фэйк. Нас бы перамаглі, і мы жылі б, як у Германіі. Скажыце гэта кожнаму спаленаму, расстралянаму, змучанаму — кожнаму трэцяму беларусу. Чаму так? Таму што чым нахабнейшая мана, тым лягчэй у яе верыць. Лепш за гебельсаўскія метады, палітычныя піяршчыкі калектыўнага Захаду нічога не знайшлі. Таму для Украіны — інфаБучы, для Беларусі былі — Акрэсціна-крэматорый. І верылі ж. Верылі. Зараз з-пад нашых ног выбіваюць глебу маралі і паважаных адносін да сваёй дзяржаўнасці. Навошта свая? Калі ёсць — вялікая амерыканская ідэя. Панавання.

Амерыка аказалася не мацнейшай у эканамічным альбо ваенным плане. Амерыка аказалася больш спрытнай у плане прапаганды. Пакуль у Савецкім Саюзе дабіваліся перамог, вынаходніцтваў, у Амерыцы здымалі фільмы пра свае фэйкавыя перамогі і вынаходніцтвы. Цяпер кіно мала, цяпер патрэбны кругласутачны кантроль.

Як падаваць інфармацыю, там навучаюць шматлікія навуковыя і ваенныя ўстановы. Дарэчы, з прыцэлам на ментальныя асаблівасці кожнага народа, кожнай дзяржавы. Шукаеш слабае месца і.... распачынаеш «каляровую рэвалюцыю». Украіна папалася на карупцыі. Яна зараз там яшчэ большая... Але, як кажуць у вашынгтонскім абкаме: «Хоць ён і клоўн, але ж наш клоўн...»

Нібыта пацыентаў бальніцы да крапельніцы, рэцыпіентаў інфармацыі прывязалі да сацыяльных медыя. І ўліваюць у нашыя мазгі і сэрцы атруту. А яна салодкая. Таму што распавядаць лісліва і хлусліва аб дрэнным лягчэй, чым аб надзённым. Ну такая ў нас натура: замест стравы са свайго агарода, смачнай і карыснай, мы цягнемся да глабалісцкага фаст-фуду. Так і з інфармацыяй — «піпл хавае». Абразлівая фраза. Гэта пра нас з вамі. Пра кожнага. Хто верыць навінам з віртуальнай рэчаіснасці больш, чым таму, што адбываецца за акном.

Нядаўна даведаўся, што шмат хто з затрыманых экстрэмістаў былі падпісантамі 50—70 варожых тэлеграм-каналаў. На розны густ, рознага стылю. Вось і паспрабуй вытрымай гэту інфармацыйную навалу. Але час, калі мы ў інфармацыйнай вайне былі пад Масквой, мінуў. Пачалі наступаць. Але самых спрытных блакіруюць. Я пра ТГ «Жоўтыя слівы». Дарэчы, традыцыйныя медыя — тэлебачанне, газеты і радыё — не заблакіруеш. А вось з ТГ іншая справа. Інтэрнэт — у руках «партнёраў». А па-іншаму яны не могуць перамагчы словы праўды. Гэта ж так «па-дэмакратычнаму». Ну, так, свабода слова — гэта прэрагатыва англасаксонскай прапаганды. Яны працуюць на нашым медыйным полі, на сваё нікога не пускаюць. Але за намі Праўда. І яна яшчэ ўзніме свой пераможны сцяг над інфармацыйным рэйхстагам заходняй маны. А пакуль адзін за адным, нібыта тыя штандары дывізій вермахта, мы працягваем кідаць пад ногі рэчаіснасці заходнія фэйкі. І колькі б іх ні было, вынік адзін — пад ногі нашай ПРАПАГАНДЫ.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Францыі інфляцыя выходзіць на пікавыя значэнні



Рост цэн у Францыі на працягу наступных месяцаў захаваецца. Пра гэта заявіў кіраўнік французскага Мінфіна Бруна Ле Мэр, паведаміла ТАСС. Па словах чыноўніка, інфляцыя ў краіне выходзіць на пікавыя значэнні, такая сітуацыя будзе захоўвацца ў найбліжэйшы час. Пры гэтым ён адзначыў, што паляпшэнняў у гэтым плане варта чакаць не раней чым у пачатку наступнага года. Бруна Ле Мэр нагадаў, што ўрад краіны збіраецца выдаваць малазабяспечаным грамадзянам прадуктовыя чэкі для набыцця сельскагаспадарчай прадукцыі мясцовай вытворчасці. Таксама да канца лета будзе дзейнічаць зніжка на бензін. Разам з тым адзначаецца, што кошт аўтамабільнага паліва на запраўках, нягледзячы на ўведзены дыскаўнт, ужо перавысіў два еўра за літр. Як адзначаюць эксперты, рост інфляцыі ў Францыі звязаны з павышэннем тарыфаў на электрычнасць, а таксама з ростам цэн на паслугі, прадукты харчавання і прамысловыя тавары.

### Пры Байдэне кошт паліва ў ЗША павялічыўся ўдвая



У ЗША цэны на бензін зноў пабілі рэкорд і выраслі ўдвая за час знаходжання Джо Байдэна на пасадзе прэзідэнта краіны. Як сведчаць даныя некамерцыйнай Амерыканскай аўтамабільнай асацыяцыі, кошт бензіну маркі Regular (адпавядае бензіну АІ-92) у ЗША дасягнуў $4,81 за адзін галон (3,785 літра). Пры гэтым у першы тыдзень пасля інаўгурацыі Байдэна паліва каштавала $2,39, паведаміла ТАСС. Самыя высокія цэны па-ранейшаму трымаюцца ў Каліфорніі, дзе адзін галон каштуе каля $6,297. У сваім нядаўнім выступленні ў Белым доме Байдэн сказаў, што зніжэнне ў краіне кошту бензіну і прадуктаў харчавання нагад ці атрымаецца дабіцца хутка.

### Упершыню ў гісторыі Брунея пасаду міністра заняла жанчына



Султан Брунея Хасанал Балкіях зрабіў кадравыя перастаноўкі ва ўрадзе, упершыню ў гісторыі прызначыўшы жанчыну на пасаду міністра. Пра гэта паведаміла The Straits Times. «Пасаду міністра адукацыі заняла Рамайза Салеха», — абвясціў манарх. Склад новага кабінета зацверджаны на найбліжэйшыя чатыры гады. Султан па-ранейшаму захоўвае за сабой ключавыя пасады: прэм'ер-міністра, міністра абароны, міністра замежных спраў, а таксама міністра фінансаў і гандлю. Пры гэтым у адстаўку адпраўлены кіраўнік МУС Аван Абу Бакар, міністр першасных рэсурсаў і турызму Алі Апон і міністр развіцця Сухаімі бен Гафар. 75-гадовы Хасанал Балкіях быў абвешчаны султанам у кастрычніку 1967-га, менш чым праз год ён быў каранаваны, выканаўчая ўлада перайшла да яго ў 1984-м.

# КАМУ АДПАЧЫВАЦЬ, А КАМУ — ПРАЦАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У краіне створана сістэма па арганізацыі круглагадовай часовай працоўнай занятасці моладзі, якая вучыцца ва ўстановах адукацыі, у вольны ад вучобы час. Прыярытэтнае права на часовае працаўладкаванне маюць моладзь з няпоўных, шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў і непаўналетнія, якія знаходзяцца на ўліку ў камісіях па справах непаўналетніх, — тлумачыць **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ.**

На часовую занятасць у 2022 годзе органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне плануюць працаўладкаваць не менш за 25 тысяч маладых людзей. Выдаткаваць на гэтыя мэты плануецца больш за сем мільёнаў рублёў бюджэтных сродкаў.

Сёлета ў студзені-красавіку ўжо заключана 500 дагавораў з наймальнікамі, акрамя таго, служба занятасці аказала садзейнічанне ў працаўладкаванні ў вольны ад вучобы час 4,3 тысячы маладых чалавек, якія вучацца. Выкарыстаны бюджэтныя сродкі на суму 605 тысяч рублёў.

Акрамя таго, орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне сфарміравалі пералік арганізацый, якія гатовы прыняць на работу моладзь без фінансавай падтрымкі дзяржавы. Гэты спіс актуальны на інфармацыйным партале дзяржаўнай службы занятасці. Дарэчы, у красавіку 2022 года на партале з'явіўся тэматычны раздзел «Часовая занятасць», які ўтрымлівае звесткі аб магчымасці працаўладкавання навучэнцаў у вольны ад вучобы час на ўмовах найму.

Цяпер час аб магчымасці забяспечыць часовую занятасць моладзі праінфармавала больш за 500 арганізацый, якія гатовы прапанаваць для гэтых мэт больш за 8 тысяч вакансій.

Пытанні рэгулявання працы моладзі замацаваны ў працоўным кодэксе. І тут ёсць шэраг нюансаў, якія мусяць ведаць і самі непаўналетнія, і іх бацькі.

— Заключэнне працоўнай дамовы дапускаецца з асобамі, якія дасягнулі 16 гадоў. Разам з тым устаноўлены ніжні парог узросту работніка — не менш за 14 гадоў. З асобамі ад 14 да 16 гадоў заключэнне працоўнага дагавора дапускаецца толькі з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў, усынавіцеля ці папячыцеля, — расказвае Святлана Коваль. — Непаўналетнія работнікі ў працоўных праваадносінах прыраўноўваюцца ў правах да паўналетніх, а ў галіне аховы працы, працоўнага часу, адпачынку і некаторых іншых умоў працы карыстаюцца гарантыямі, устаноўленымі заканадаўствам.

Важна ведаць, што прыём на работу асоб, маладзейшых за 18 гадоў, магчымы толькі пасля папярэдняга медыцынскага агляду. Пры заключэнні працоўнага дагавора з непаўналетнімі наймальнік не мае права ўстанаўліваць ім папярэдняе выпрабаванне. Асобам, маладзейшым за 18 гадоў, забаронена работа па сумяшчальніцтве. Таксама заканадаўства забараняе прымяняць працу непаўналетніх на цяжкіх работах і работах з небяспечнымі ці шкоднымі ўмовамі працы, а таксама на падземных і горных работах.

— Для работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, устанаўліваецца скарочаная працягласць працоўнага часу. Для непаўналетніх ад 14 да 16 гадоў яна складае не больш за 23 гадзіны ў тыдзень, ад 16 да 18 — не больш за 35 гадзін у тыдзень, — нагадвае суразмоўца. — Работнікі да 18 гадоў не дапускаюцца да работы ў начны час — з 22 да 6 гадзін, а таксама да звышурочных работ, работ у дзяржаўныя святы і святочныя дні. Непаўналетнім не ўстанаўліваецца ненармаваны рабочы дзень. Таксама важна, што аплата працы работніка да 18 гадоў пры скарочанай працягласці штодзённай працы адбываецца ў тым жа памеры, як аплата працы работніка адпаведных катэгорый пры поўнай працягласці рабочага дня.

Звольніць непаўналетняга таксама не так проста. Заканадаўства ўтрымлівае шэраг гарантый пры скасаванні дагавораў з работнікамі да 18 гадоў. Звальненне па некаторых падставах дапушчальнае толькі са згоды камісіі па справах непаўналетніх.

**Алена КРАВЕЦ.**

Праблема і рашэнне

# НЕ ПАТАНУЦЬ У МОРЫ СМЕЦЦЯ

## Што робіцца ў Беларусі для памяншэння аб'ёму пластыкавых адходаў

**16 рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў сумарнай магутнасцю каля 1,2 млн тоны адходаў у год будуць створаны ў Беларусі да 2025 года. Міністэрства ЖКГ да 2024 года плануе ўкараніць дэпазітную закладную сістэму абарачэння спажывецкай упакоўкі. На думку экспертаў, гэта дазволіць у два-тры разы павялічыць збор адходаў упакоўкі, найперш пластыкавых бутэлек. А на Гродзеншчыне да снежня 2022-га павінна з'явіцца новая вытворчасць па выпуску больш як 242 млн штук шклатары ў год. Пра гэтыя і іншыя напрамкі барацьбы з пластыкам расказалі эксперты.**



### Новыя колеры і формы

Беларусь таксама скіравана на змяншэнне выкарыстання палімернай упакоўкі і павелічэнне ўжывання экалагічна бяспечнай, у тым ліку біяраскладальнай, таму ў Беларусі дзейнічае пашыраная адказнасць вытворцаў і пастаўшчыкоў асобных відаў тавараў.

Прынцып пашыранай адказнасці абавязвае вытворцаў і пастаўшчыкоў несці адказнасць за ўтылізацыю ўпакоўкі, у якой пастаўляецца тавар. Сёлета прадугледжана пашырэнне відаў адходаў, за якія вытворцы і пастаўшчыкі выплачваюць кампенсацыю, — у пералік уключаны адходы паперы і кардону з прамочваннем і пакрыццём, накшталт упакоўкі тэтра-пак і пюрпак. Кампенсацыя за іх складзе 150 рублёў за тону адходаў, расказаў **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

— Прадугледжана таксама пашырэнне пераліку прадукцыі, для вытворчасці якой прымяняецца шкляная бутэлька, і павелічэнне памеру кампенсацыі расходаў (з 15 да 17 капеек за штуку) за прымяненне шкляных бутэлек пры вытворчасці і разліве ўсіх відаў пітной вады (газіраванай, негазіраванай, мінеральнай).

Каб павялічыць вытворчасць шкляной тары і пашырыць яе асартымент, прадугледжаны «аблегчаныя» бутэлькі з больш шырокім асартыментам колераў і форм такой тары. На Гродзенскім шклозаводзе, напрыклад, рэалізоўваецца інвестпраект па стварэнні вытворчасці шкляной тары з выкарыстаннем інавацыйных энергаэфектыўных і энергазберагальных тэхналогій, падкрэсліў эксперт:

— Прадугледжана будаўніцтва новай сучаснай вытворчасці шклатары на трох лініях шклаварнай печы прадукцыйнасцю 220 тон шкламасы ў суткі. Гэта дазволіць выпускаць больш за 242 млн штук шклатары ў год, у тым ліку асвоіць выпуск аблегчанай шкляной бутэлькі. На заводзе летась ужо асвоілі выпуск новых відаў шклатары для разліву піва і лікёрагарэлачных вырабаў.

### Абгортачная папера і біяраскладальны посуд

У НАН Беларусі распрацоўваюць тэхналогіі вырабу біяраскладальнай упакоўкі з раслiннай сыравіны. Поўнасцю выкананы праект па распрацоўцы саставаў і метадаў атрымання дабавак для функцыяналізацыі цэлюлозна-папяровых матэрыялаў з павышанымі антымікробнымі і антыаксідантнымі бар'ернымі ўласцівасцямі.

— Распрацаваны два тыпы актыўных саставаў і метады атрымання бяспечных упаковак для ўдасканалення абгортачнай паперы і іншых матэрыялаў. А на базе Інстытута агульнай неарганічнай хіміі НАН плануецца арганізаваць вопытную вытворчасць распрацаваных актыўных саставаў, якія павялічваюць тэрміны захоўвання ўпакаванай у паперу харчовай прадукцыі, — падзяліўся Максім Тарасаў. — А ў Інстытуце жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН ствараюць лабараторыі па сертыфікацыі біяраскладальнай упакоўкі.

Інстытут мікрабіялогіі НАН і Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем БДУ рэалізуюць асобны праект — распрацоўку тэхналогіі атрымання лактыду і полілактыду, заснаванай на малочнай ферментацыі вугляроднай сыравіны. Па выніках праекта будзе створана тэхналогія атрымання біяраскладальнага палімера — полілактыду, які з'яўляецца сыравінай для біяраскладальнай плёнкі, іншых упаковачных матэрыялаў і посуду.

У Беларусі налічваецца каля 160 вытворцаў і імпарцёраў тары і ўпаковачнай прадукцыі, аднаразовага посуду са шкла, паперы, кардону і біяраскладальнай сыравіны. Не менш за 40 з іх — гэта вытворцы і пастаўшчыкі аднаразовага посуду з паперы, кардону, дрэва і біяраскладальнага посуду з цукровага трыснягу і кукурузнага крухмалу.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Грошы

# На таргах біржы доля юаня дасягнула 5 %

**У цяперашні час здзелкі з кітайскай валютай стабільна заключаюць на біржы 20 банкаў і восем юрыдычных асоб**

**Пра гэта паведаміў старшыня праўлення БВФБ Андрэй АЎХІМЕНЯ на першым Еўразійскім эканамічным форуме ў Бішкеку. Ён распавёў, што таргі юанем на БВФБ былі запушчаныя 18 сакавіка 2022 года, і ўсяго за два месяцы было здзейснена больш за тысячу здзелак на звыш 850 мільёнаў юаняў.**

Раней, выступаючы на агульным сходзе Міжнароднай асацыяцыі біржаў СНД, Андрэй Аўхіменя паведаміў, што калі адразу пасля запуску таргоў аб'ёмы былі невялікімі — каля 10 мільёнаў юаняў у дзень, то ў маі яны дасягнулі 50 мільёнаў юаняў, а доля юаня на валютных таргах у цяперашні час перавышае 11 %, хоць у першы час пасля пачатку таргоў гэтая доля складала каля 3,5 %.

Пры гэтым у таргоў кітайскай валютай ёсць добрыя перспектывы, бо цяпер адбываецца замяшчэнне імпартных паставак з заходніх краін на пастаўкі з Кітая і Расіі. Біржа дае магчымасць беларускім кампаніям купляць і прадаваць кітайскі юань па рынкавым курсе, што павялічвае іх даходы.

У цяперашні час таргі на БВФБ пакрываюць толькі каля 8 % ад тавараабароту паміж КНР і Беларуссю, таму тэарэтычна магчымы рост аб'ёмаў аперацый з кітайскай валютай у некалькі разоў. У цэлым на біржы чакаюць, што ў бягучым годзе абарот з юанямі на ёй перавысіць 5 мільярдаў долараў у эквіваленце.

На думку кіраўніка БВФБ, арганізацыя таргоў юанямі дазволіла павялічыць біржавы аб'ём таргоў валютамі. Андрэй Аўхіменя таксама паведаміў, што калі беларускія банкі як купляюць, так і прадаюць юань на біржавых таргах, то прадпрыемствы ў асноўным прадаюць юані, якія атрымліваюць ад экспарту сваёй прадукцыі ў Кітай. Пры гэтым таргі юанем на біржы праходзяць гэтак жа, як і асноўнымі валютамі — доларам, еўра і расійскім рублём.

Цікавасць да кітайскай валюты беларускія камерцыйныя банкі праяўляюць не толькі на БВФБ, але і на рынку аперацый з фізічнымі асобамі. У прыватнасці, «Цэптэр Банк» першым сярод банкаў краіны прапанаваў насельніцтву магчымасць адкрыць дэпазіт у юанях. Уклады прымаюцца ў Мінску і Брэсце. Мінімальная сума ўкладу — 500 юаняў, гэта каля 200 беларускіх рублёў. Працэнтная стаўка роўная 3 % гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ОАО «Управление специальных строительных работ**
**Стройтрест № 7»**
**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 20 июня 2022 г. внеочередного общего собрания**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1) Об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования приобретенных Обществом акций собственной эмиссии в целях сокращения их общего количества.

2) О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и утверждении его новой редакции.

Место проведения собрания: г. Минск, пр-т Машерова, 16-2б.
Начало работы собрания в 11.00.
Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения.
Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.
Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 10 июня 2022 г.
Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 07.06.2022 № 07-06/2022.
С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 09.06.2022, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 16-2б.

*Совет директоров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».*

УНП 100088916

# «Конкурс у экспедыцыю — 4-5 чалавек на месца»

## Надзвычай плённы сезон

Трэба патлумачыць, што Беларускую антарктычную станцыю ўдзельнікі экспедыцыі пакінулі яшчэ 27 красавіка. Дарога дадому заняла цэлых 25 дзён і была вельмі мудрагелістай. Сёння на шостым кантыненце беларусаў няма, але метэаралагічная інфармацыя працягвае адтуль паступаць. Гэта стала магчымым дзякуючы ўвядзенню ў эксплуатацыю ў раёне базіравання нашай экспедыцыі аўтаматычнай метэастанцыі, якая па каналах спадарожнікавай сувязі чатыры разы ў суткі круглагадова будзе перадаваць цяпер на Вялікую зямлю актуальную метэаінфармацыю.

— Я параўнаў бы гэту падзею з запускам першага спадарожніка Зямлі, калі з космасу прыйшоў першы сігнал. Такіх станцый у Антарктыцы не больш за дзясятак, і адна з іх цяпер — наша. Яна закрывае вялізную белую пляму там, дзе не размешчана аналагічных станцый. Таму гэта насамрэч асаблівая падзея, якую цяжка пераацаніць, гэта не проста сігнал, а паўнавартасная навуковая інфармацыя, — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў.

Апошняя 14-я экспедыцыя аказалася самай працяглай і доўжылася 184 дні. «Мы тры-чатыры апошнія гады паступова павялічваем працягласць сезонных работ, — патлумачыў начальнік экспедыцыі. — Плануем і далей пашыраць часавыя рамкі сезона ў ходзе падрыхтоўкі да зімовых мерапрыемстваў. Антарктыда ніколі не бывае ласкавай, але ў цэлым сезон выдаўся спрыяльны для правядзення навуковых даследаванняў і інжынерных работ, і з навуковага пункту погляду — надзвычай плённы. Заданні дзяржпраграмы выкананы ў поўным аб'ёме».

Сярод напрамкаў навуковых даследаванняў, над якімі працавалі палярнікі, — комплексны наземны спадарожнікавы маніторынг атмасферы і падсцілаючай паверхні ў Антарктыдзе, гідрахімічныя, біялагічныя, экалагічныя даследаванні марскіх і прэснаводных экасістэм, маніторынг азонавага слоя і ўльтрафіялетавай радыяцыі ў Антарктыцы, даследаванні змяненняў прыроднага асяроддзя і клімату, метэаралагічныя назіранні. Акрамя таго, было рэалізавана шэсць факультатыўных праграм.

Аляксей Гайдашоў з задавальненнем адзначыў, што цікавасць да ўдзелу ў антарктычных даследаваннях расце з боку самых розных акадэмічных арганізацый. Так, у складзе апошняй экспедыцыі шчыравалі навуковыя супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў, Інстытута фізікі, Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах, Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы (БДУ). Акрамя асноўных навуковых даследаванняў па васьмі напрамках у рамках новай дзяржаўнай праграмы па вывучэнні Антарктыкі, яны выконвалі яшчэ і шэсць факультатыўных. Інтарэс праявілі Інстытут фізіялогіі НАН, РНПЦ па харчаванні, Інстытут мікрабіялогіі, Інстытут мяса-малочнай прамысловасці, Інстытут механікі металапалімерных сістэм.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Праводзіліся эксперыментальныя выпрабаванні прадуктаў харчавання, медыцынскія, фізіялагічныя і псіхалагічныя даследаванні.

Акрамя таго, беларускія навукоўцы прынялі ўдзел у двух буйных міжнародных праектах. Адзін з іх — беларуска-нямецкі «Нестабільнасць ледніковага шчыта Усходняй Антарктыкі». Даследчыкі працавалі ў галіне палеагеаграфіі і дакладнай геадэзічнай прывязкі граніц леднікоў, якія знаходзяцца ў раёне базіравання Беларускай антарктычнай станцыі. «Палявое супрацоўніцтва працягвалася тры тыдні. Гэты дух таварыства, узаемадапамогі ў Антарктыцы, нягледзячы на знешнія фактары, захоўваецца і будзе захоўвацца. Ён быў і ў савецкія часы, у разгар халоднай вайны, мы выдатна супрацоўнічалі па навуковых напрамках з усімі краінамі. Спадзяёмся, што так і застанецца», — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў.

Мэтай жа беларуска-турэцкага праекта было вывучыць магчымую міграцыю і знаходжанне ў прыродным асяроддзі Антарктыкі мікрапластыку. «Гэта вельмі актуальная тэма, таму што ўжо ёсць пацвярджэнне, што негатыўная антрапагенная дзейнасць чалавека дасягнула Антарктыды, — канстатаваў Аляксей Гайдашоў. — Там таксама ўжо знаходзяць сляды мікрапластыку і гэта вельмі трывожныя сімптомы».

## Гатоўнасць да зімоўкі № 1

Таксама ўдзельнікі 14-й экспедыцыі выканалі вялікі аб'ём інжынерных работ для развіцця другой чаргі інфраструктуры Беларускай антарктычнай станцыі. У строй былі ўведзены сучасныя гаражныя боксы з поўным наборам абсталявання для рамонту снегаходнай, усюдыходнай тэхнікі, а таксама радыёпразрыстае сховішча (купал) для антэны спадарожнікавай сувязі, якое дае магчымасць пасля завяршэння сезона не дэманціраваць антэну кожны раз. Сістэма раздачы сігналу Wi-Fi запушчана на ўсёй тэрыторыі станцыі. «Цяпер у навуковых, практычных, інжынерных мэтах і нават для таго, каб звязацца са сваімі блізкімі, не трэба бегаць да пэўнага вузла сувязі. Можна размаўляць на ўсёй тэрыторыі станцыі з любога пункта як у спрыяльныя метэаўмовы, так і ў неспрыяльныя. Гэта вельмі вялікі якасны крок наперад, у тым ліку з псіхалагічнага пункту гледжання», — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў.

Працягваецца і нарошчванне транспартнага складніка. Сёлета беларускія палярнікі даставілі ў Антарктыду новы транспартны сродак — ратрак. Гэта гусенічны ўсюдыход, здольны выконваць мноства навуковых і тэхнічных функцый, забяспечваць далёкія паходы, расчышчаць снежныя завалы, падымаць і перавозіць цяжкія грузы, дастаўляць ваду і паліва. На цяперашнім этапе развіцця экспедыцыйнай інфрастуктуры гэта вельмі значны элемент.

Развіваюць палярнікі і сістэму інжынерных камунікацый. У гэтым сезоне зманціравалі стацыянарна сістэму вонкавага водаправода, які абаграваецца. Ён злучае некалькі збудаванняў нашай станцыі і пазбаўляе ад вельмі многіх клопатаў і праблем.

Таксама праводзілася праверка гатоўнасці асноўных сістэм энергазабеспячэння станцыі да будучых зімовачных мерапрыемстваў. «Нашы спецыялісты ў гэтым сезоне зманціравалі поўнасцю аўтаматызаваную сістэму кіравання, кантролю параметраў работы. Гэта значыць, што ўсе чатыры нашы дызель-электрастанцыі аб'яднаны адзінай сістэмай кіравання і кантролю плюс дублюючай. Мы разумеем, што нельга спадзявацца толькі на электроніку, таму ўсё прадубліраванае. Надзейнасць, аўтаномнасць і дубліраванне на выпадак крытычных сітуацый сістэм жыццезабеспячэння былі пацверджаны практычнымі мерапрыемствамі. Таксама былі створаны запасы паліва, арганізавана новая нафтабаза, — падкрэсліў начальнік экспедыцыі. — Мы планамерна, крок за крокам, завяршаем працэс падрыхтоўкі інфраструктуры станцыі да правядзення зімовачных мерапрыемстваў. У дзяржпраграме правядзенне пілотных зімовачных мерапрыемстваў запланавана на 2023 год. Давайце казаць прама: мы павінны перазімаваць, выявіць усе слабыя месцы, правесці работу над памылкамі і толькі пасля гэтага запускаць станцыю ў паўнавартасным круглагадовым рэжыме».

## Змена пакаленняў

Яшчэ адзін важны складнік — кадры. За апошнія гады быў створаны істотны штатны састаў, як асноўны, так і дублюючы. «Сёння ў нас няма дэфіцыту ў спецыялістах ні па навуковых напрамках, ні па тэхнічных, — кажа Аляксей Гайдашоў. — А конкурс у экспедыцыю, як у прэстыжнай ВНУ, — 4-5 чалавек на адно месца. Прызнаюся, што гэты паказчык вельмі радуе».

Дарэчы, як высветлілася, Аляксей Гайдашоў, самы вопытны беларускі палярнік, не любіць, калі яго называюць нязменным кіраўніком усіх беларускіх антарктычных экспедыцый, хоць гэта насамрэч так. Ён падкрэслівае, што павінна быць змена пакаленняў. І ён гэту змену якраз і рыхтуе. У складзе апошняй экспедыцыі былі трое навічкоў. Аляксей Гайдашоў кажа, што навічка навучыць досыць складана: ён можа быць суперпрафесіяналам на Вялікай зямлі, але ў Антарктыдзе вельмі шмат нюансаў, складанасцяў, асаблівыя ўмовы жыцця. Таму кожны пачынае там з чыстага ліста.



Для палярнікаў, якія доўгі час знаходзяцца ва ўмовах ізаляцыі, вельмі важны псіхалагічны складнік. Сёлета экспедыцыі папярэднічаў двухтыднёвы каранцін у Кейптаўне. Знаходжанне ў замкнёнай прасторы стала своеасаблівай трэніроўкай, праверкай псіхафізіялагічнага стану ўдзельнікаў. Усе аказаліся на вышыні. Падчас знаходжання ў Антарктыдзе хлопцы перыядычна праходзілі псіхалагічнае тэсціраванне, іх стан аналізавалі спецыялісты на Вялікай зямлі, што дазволіла папярэджваць непажаданыя сітуацыі і найбольш рацыянальна задзейнічаць іх у розных відах работ. Трэба заўважыць, што апошняя экспедыцыя прадугледжвала шмат менавіта індывідуальнай работы.

Вядома, пасля запуску інтэрнэт-сістэмы новага пакалення знаходжанне ў ізаляцыі значна спрасцілася. Яна дазваляе перадаваць вялікія аб'ёмы навуковай інфармацыі, фота- і відэаінфармацыі, карыстацца сучаснай тэлемедыцынай. А члены экспедыцыі могуць без праблем кантактаваць са сваімі роднымі ў месенджарах, прычым быць з імі на відэасувязі. «Гэта вельмі якасны крок наперад: як тэхнічны, так і псіхалагічны, — кажа Аляксей Гайдашоў. — Асабліва для пакалення, якое не можа абыходзіцца без гаджэтаў».

Натуральна, усіх цікавіць, як можна трапіць у Антарктыду, бо гэта ж не звычайнае падарожжа і нават не экстрэмальны турызм. Сярод патрабаванняў — добрае здароўе, прафесіяналізм і адказнае стаўленне да справы. Кожны ўдзельнік павінен быць спецыялістам у якой-небудзь з навуковых сфер, прычым вельмі высокага ўзроўню. Акрамя таго, ён мусіць выконваць і работу па іншых профілях. Але галоўнае ва ўмовах ізаляцыі ад Вялікай зямлі — усё ж поўная псіхалагічная сумяшчальнасць удзельнікаў экспедыцыі, іх кантактнасць, камунікабельнасць і маральна-валявыя якасці: каб можна было цалкам давяраць чалавеку, які знаходзіцца побач з табой.

Аляксей Гайдашоў запэўнівае, што дарога ў Антарктыду не закрытая і для жанчын: «Яны працуюць у многіх міжнародных экспедыцыях: хімікамі, біёлагамі, медыкамі... Але, заключыўшы кантракт на работу ў Антарктыцы, жанчына, умоўна кажучы, страчвае свой пол і становіцца проста супрацоўнікам, без усялякіх скідак.. Можа быць, яшчэ наконт прысутнасці жанчын у круглагадовай экспедыцыі я засумняваўся бы, але для сезонных экспедыцый гэта нармальная практыка. Дарэчы, калісьці калегі з Вялікабрытаніі, паглядзеўшы фота беларускай палярнай станцыі, вырашылі зрабіць нам заўвагу. Маўляў, вы не захоўваеце гендарную роўнасць. Але мы ім даказалі, што на нашай новай станцыі і для жанчын створаны ўсе бытавыя ўмовы...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота НАН.**

У камандзе 14-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі працавалі: Аляксей Гайдашоў — начальнік экспедыцыі, Аляксей Хаткевіч — начальнік сезоннай палявой базы, Уладзімір Несцяровіч — спецыяліст, механік; Ягор Корзун — біёлаг-эколаг; Сяргей Люты — вядучы спецыяліст, загадчык вытворчасцю харчавання, Ігар Аляксееў — навуковы супрацоўнік (фізіка атмасферы), Сяргей Пунінскі — урач-хірург; Аляксандр Абатурын — электрык, спецыяліст па сродках УКХ і КВ-сувязі, Юрый Падшывалаў — навуковы супрацоўнік, метэаролаг; Мікалай Зінькевіч — праграміст і Артур Івашка — інжынер.

# Ежа для гіены

## Навошта Польшча падлашчваецца да Украіны?

**Наспеў момант падпісання новага пагаднення паміж Кіевам і Варшавай, паколькі папярэдняе было падпісана ў 1992 годзе — у іншую эпоху, калі Польшча і Украіна знаходзіліся ў іншай рэальнасці. Пра гэта польскаму выданню PAP заявіў намеснік кіраўніка МЗС Польшчы Марцін Пшыдач. «Украіна дакладна падтрымала празаходні курс», — падкрэсліў польскі дыпламат. У кантэксце паглыблення адносін паміж Польшчай і Украінай Пшыдач звярнуў увагу на стварэнне ў ліпені 2020 года і інтэнсіфікацыю работы Люблінскага трохвугольніка (Польшча, Літва, Украіна). Як вядома, падчас свайго выступлення ў Вярхоўнай радзе Украіны 22 мая прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда заявіў, што настаў час заключыць новы дагавор аб добрасуседстве. Яго ўкраінскі калега Уладзімір Зяленскі падтрымаў гэтую ініцыятыву. Як заўважаюць эксперты, апошнія падзеі паказваюць узрослую актыўнасць Варшавы ў дачыненні да Кіева. Пры гэтым усё часцей гучыць «братэрская» рыторыка. Навошта Польшча падлашчваецца да Украіны, да чаго гэта прывядзе?**




### ПЛАНЫ ЗАХОПУ

Польшча пачынае ажыццяўляць захоп заходніх тэрыторый Украіны. Пра гэта на мінулым тыдні паведаміў сакратар Савета бяспекі Расіі Мікалай Патрушаў, перадала ТАСС. Ён назваў сведчанні рэалізацыі планаў Варшавы па ўмяшанні ва ўкраінскі крызіс. «Заходнія партнёры» Кіева імкнуцца скарыстацца бягучай сітуацыяй у карыслівых інтарэсах, маючы асаблівыя планы на ўкраінскай зямлі. «Яскравым таму пацвярджэннем стаў візіт у Кіеў польскага прэзідэнта Дуды, а таксама яго заявы аб тым, што неўзабаве польска-ўкраінская граніца перастане існаваць. Мяркуючы па ўсім, Польшча ўжо пераходзіць да дзеянняў па захопе заходніх украінскіх тэрыторый», — падкрэсліў Мікалай Патрушаў.

Тым часам «братэрская» рыторыка нарошчваецца — праз некалькі дзён стала вядома, што кіраўнік польскага ўрада Матэвуш Мараўецкі бачыць Польшчу і Украіну дзвюма дзяржавамі, якія дапаўняюць адна адну. Аб гэтым ён заявіў у Кіеве па выніку кансультацый паміж урадамі дзвюх краін, паведаміла ТАСС. Пры гэтым у



Службе знешняй разведкі Расіі папярэджвалі аб намеры Варшавы ўвесці войскі ў Заходнюю Украіну на падставе яе «абароны ад расійскай агрэсіі». Паведамляецца, што польская адміністрацыя разлічвае на раскол краіны, пры якім «па сутнасці атрымае пад кіраванне тэрыторыі, на якія ўвойдуць «польскія міратворцы».

Сваю выгаду ва ўкраінскім канфлікце шукаюць і ЗША. Нягледзячы на рост тэрарыстычнай небяспекі ва Украіне, з-за чаго ў небяспечнай сітуацыі аказалася грамадзянскае насельніцтва, Вашынгтон працягвае пастаўкі зброі Кіеву, адзначыў Мікалай Патрушаў.

### ШОК ДЛЯ ЧЭРЧЫЛЯ

ЗША і краіны НАТА з 2014-га актыўна ўзбройвалі і рыхтавалі ўкраінскую армію з дапамогай сваіх інструктараў, ператвараючы яе ў плацдарм для нападу на Расію. На тэрыторыі Украіны рэгулярна праводзіліся ваенныя манеўры: толькі сёлета альянс планаваў там дзевяць вучэнняў. Не менш актыўна нарошчвалася прысутнасць ЗША і НАТА ва Усходняй Еўропе ў цэлым. Вядучую ролю тут адыгрывала Польшча, якая, у прыватнасці, заяўляла аб гатоўнасці размясціць на сваёй тэрыторыі амерыканскую ядзерную зброю. У 2020-м Польшча, Літва і Украіна абвясцілі аб стварэнні «Люблінскага трохвугольніка», які ўкраінскі МЗС адкрыта назваў увасабленнем польскай ідэі «міжмор'я».

Нельга выключаць, што Польшча выношвае планы паўзучай экспансіі ва Украіне. Аб гэтым заявіла афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. «Нельга больш гэтага не бачыць. Ідзе проста паглынанне Украіны польскімі ўладамі, грамадзянамі, сілавымі структурамі. Гэтыя планы ўжо маюць не проста нейкія такія асобныя ілюстрацыі, а суцэльную карціну», — падкрэсліла Марыя Захарава.

Варшава пры першай магчымасці адбярэ ва Украіны яе заходнія тэрыторыі. Такое меркаванне выказаў памочнік прэзідэнта Расіі Уладзімір Мядзінскі, паведаміла ТАСС. Па яго словах, сёння ў Кіева такія сябры, што з імі і ворагаў не трэба. Так, Польшча пры першым зручным выпадку паспрабуе «адгрызці заходнеўкраінскія землі». Мядзінскі адзначыў, што, ведаючы гісторыю, ніколькі не сумняваецца ў магчымасці такога зыходу. Прэцэдэнт ужо ёсць. «У 1938 годзе, калі дзялілі Чэхаславакію, таксама вялікага сябра Польшчы, замест таго, каб абараняць яе як саюзніка, Польшча адгрызла Цешынскую вобласць», — расказаў Уладзімір Мядзінскі. Такія паводзіны Варшавы шакіравалі нават дасведчанага палітыка, тагачаснага кіраўніка брытанскага ўрада Уінстана Чэрчыля, які тады ахрысціў Польшчу «гіенай Еўропы». Мяркуючы па ўсім, як трапна заўважыў партал rubaltic.ru, цяпер гіена зноў на паляванні. І трафей зразумела, які.

### ДОЎГАЯ ВАЙНА І «АДКАТЫ»

Падпісаныя пагадненні паміж Польшчай і Украінай на практыцы азначаюць, што Кіеў фактычна перадае Варшаве кіраванне несапраўднай украінскай дзяржавай. Такое развіццё сітуацыі можна назваць мяккай анексіяй, лічыць аглядальнік партала The Cradle бразільскі журналіст Пепэ Эскабар. Ён адзначыў, што падчас апошняга візіту прэзідэнта Польшчы Анджэя Дуды ў Кіеў былі падпісаны шэраг важных пагадненняў. Гэта ўказвае на тое, што Варшава мае намер атрымаць вялікую выгаду з канфлікту, каб узмацніць свой ваенна-палітычны, эканамічны і культурны ўплыў на захадзе Украіны.

Так, згодна з дасягнутымі дамоўленасцямі паміж Дудам і Зяленскім, грамадзянам Польшчы будзе дазволена абірацца ў органы дзяржаўнай улады Украіны і нават станавіцца канстытуцыйнымі суддзямі. «Варшаве нават не давядзецца ўводзіць войскі. Назавіце гэта мяккай анексіяй», — лічыць Пепэ Эскабар. Ён таксама заўважыў, што зараз Польшча стала фарпостам для перакідкі зброі і наймітаў ва Украіну, што выгадна для ЗША.




Вашынгтон, па сутнасці, імкнецца да дзвюх мэт. Па-першае, да працяглай вайны ва Украіне ў стылі паўстанцкага руху, як гэта было ў Афганістане ў 1980-х, толькі з заменай джыхадзістаў на наймітаў і неанацыстаў. Па-другое, паслабленне Расіі ў ваенных і эканамічных адносінах з дапамогай санкцый. Вядома, у ЗША ёсць і іншыя мэты, якія можна рэалізаваць дзякуючы канфлікту ва Украіне.

Пераабранне дэмакратаў на прамежкавых выбарах у ЗША, уліванне сродкаў у амерыканскі ваенна-прамысловы комплекс (гэтыя сродкі пасля вяртаюцца чыноўнікам у выглядзе «адкатаў»), а таксама захаванне гегемоніі долара ЗША. Але адной з галоўных мэт з'яўляецца разбурэнне эканомікі Германіі, а такім чынам, і эканомікі ЕС, у выніку чаго большая частка ацалелых кампаній будзе ў канчатковым выніку прададзена амерыканскаму бізнесу. Як лічыць Пепэ Эскабар, план Вашынгтона ў тым, каб падтрымліваць новую «доўгую вайну», якая падсілкоўваецца шэрагамі наймітаў і суправаджаецца перыядычнымі эскалацыямі з боку краін НАТА — ад Польшчы і маленькіх балтыйскіх дзяржаў да Германіі.

### УЛАДЫ НАБЫЛІ КАРПАРАЦЫІ

Прыкормленая афіцыйнай Варшавай прэса працягвае фарміраваць грамадскую думку аб тым, што ў новых геапалітычных рэаліях Украіне лепш быць у складзе Польшчы. Так, галоўны рэдактар Gazeta Polska Томаш Сакевіч заявіў аб стварэнні «агульнага арганізма» ў асобе аб'яднання дзвюх краін. У інтэрв'ю Niezalezna.pl Сакевіч заявіў ні многа ні мала пра «спробу аднавіць сувязі паміж Польшчай і Украінай з часоў Першай Польскай Рэспублікі», якая ўзнікла ў 1569 годзе пасля падпісання Люблінскай уніі.

Аднак, як лічыць аглядальнік польскага выдання Dziennik Polityczny Ханна Крамер, Варшава падчас дыпламатычнай вайны з Масквой трапіла ў пастку ўласнай ваеннай прапаганды. «Ніхто з палітыкаў не хоча прызнаваць, што сам стварае напружанасць, таму барацьба за ўласныя мэты пераназываецца ў барацьбу за мір», — лічыць яна. Як заўважыла Ханна Крамер, «правячая партыя ў Польшчы проста адмаўляецца прызнаць, што польскіх палітыкаў даўно набылі ЗША ці карпарацыі. Яны жудасна хлусяць і не звяртаюць увагі на добрыя адносіны з суседзямі. Ім усё роўна, што будзе з палякамі».

Аглядальнік Dziennik Polityczny ўдакладняе, што зараз пад маркай пагрозы з боку Расіі ў Польшчы дыслакавана да 12 тысяч амерыканскіх салдат. «Ніхто не ведае, чым займаюцца замежныя войскі ў Польшчы, — адзначае Ханна Крамер. — Польскія ўлады не толькі кампраметуюць нашу краіну перад усім светам, але і ўвекавечваюць выяву Варшавы як краіны, якая імкнецца да экспансіўнай вайны замест абароны сваіх граніц і ўнутранага міру».

Стала вядома, што польскія ўлады могуць пайсці па шляху Украіны, запаўняючы войска крымінальнікамі з турмаў. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле аглядальніка Dziennik Polityczny Марэка Галаша. На думку аўтара артыкула, польскія ўлады могуць пайсці на падобную авантуру, каб пакрасавацца перад партнёрамі па Еўрасаюзе. «Наш урад працуе супраць уласных грамадзян, таму што яго гатоўнасць пакрасавацца перад еўрапейскімі партнёрамі вялікім войскам можа прывесці да перайманне ўкраінскаму вопыту — вызвалення крымінальнікаў з турмаў для запаўнення вакансій у войску», — піша журналіст.

Ён адзначае, што ў канцы мая Міністэрства нацыянальнай абароны Польшчы пачало дадатковы набор у добраахвотніцкае войска, паколькі прыняло рашэнне павялічыць колькасць войска да 300 тысяч чалавек. Пры гэтым спецыяльны адбор для ахвотных папоўніць вайсковыя шэрагі Польшчы не праводзіцца. «Улічваючы той факт, што абяцаны мінімум навучання сур'ёзна паўплывае на якасць і прэстыж Войска Польскага і статыстыку злачыннасці, можна сказаць, што Міністэрства нацыянальнай абароны яўна не імкнецца аднавіць прэстыж вайсковай службы», — заўважыў аглядальнік Dziennik Polityczny.

### ІНФЛЯЦЫЯ І ГАЛЛЁ

Пасол ЗША ў Польшчы Марэк Бжэзінскі анансаваў маштабнае будаўніцтва амерыканскіх вайсковых аб'ектаў на польскай тэрыторыі, паведаміла ТАСС. Паводле слоў дыпламата, за дзесяць гадоў у Польшчы будзе ўзведзена больш за 110 аб'ектаў ваеннага прызначэння. Размова ідзе аб трэніровачных аб'ектах, блоках харчавання, казармах і інш. Пасол адзначыў, што мэта такога будаўніцтва — значна павысіць ваенную гатоўнасць. У сваю чаргу кіраўнік абароннага ведамства Польшчы Марыюш Блашчак заявіў, што ў польскім населеным пункце Повідз пачынаецца ўзвядзенне складскіх памяшканняў для захоўвання амерыканскай зброі. Усяго ў Польшчы плануецца пабудаваць 56 складоў, пяць з якіх дастануцца палякам, астатнія — амерыканцам.

Відавочна, што пры такім раскладзе Украіна — фігурка на шахматнай дошцы ЗША. Такім меркаваннем падзяліўся палітолаг Пётр Пятроўскі ў эфіры «Альфа Радыё». Эксперт мяркуе, што польскія эліты зарабляюць на санкцыях. «Віцэ-прэм'ер Польшчы ўжо сказаў, што ўсе грошы для дапамогі Украіне павінны ісці праз Польшчу. Гэта мільярды долараў. І калі пракруціць іх праз польскія банкі — гэта ўскоснае падаткаабкладанне. Таму ў польскіх эліт і адкрыўся такі шавінізм. Аднак выдаткі панясуць простыя грамадзяне, перавозчыкі, фермеры і прадпрыемствы. Але жыццё простых палякаў нікога не хвалюе», — сказаў Пётр Пятроўскі.

Тым часам стала вядома, што гадавая інфляцыя ў Польшчы ў маі склала 13,9 працэнта. Гэта найвышэйшы паказчык з 1998-га, паведамляе інфармацыйны партал польскага радыё RMF 24. Прыкметна падаражэла аўтамабільнае паліва — на 35,4 працэнта. Цэны на энерганосьбіты выраслі на 31,4 працэнта. Кошт прадуктаў харчавання і безалкагольных напояў у Польшчы падняўся на 13,5 працэнта. Польскі эканаміст Вітольд Арлоўскі прагназуе, што ў найбліжэйшыя тыдні трэба чакаць інфляцыю на ўзроўні 15—20 працэнтаў. Пры гэтым найбольш значна будуць даражэць прадукты харчавання. Па словах эксперта, чакаць паляпшэння сітуацыі ў Польшчы не варта.

Улады дазволілі палякам збіраць больш галля, каб абаграваць жыллё. «Мы значна пашыраем доступ палякаў да самастойнага атрымання драўніны ў лесе. Гаворка ідзе пра збор галля, у асноўным — галінак», — заявіў у эфіры тэлеканала Polsat прэс-сакратар Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных лясоў Польшчы Міхал Гзоўскі. Ён удакладніў, што па дазвол трэба звярнуцца да ляснічага, а той пакажа месца. Пры гэтым збіраць можна толькі галлё, якое ляжыць, і таўшчынёй не больш за сем сантыметраў.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00053

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего обществу с ограниченной ответственностью «Гипспромресурс», УНП 810001131, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 169-11Б/2015 в экономическом суде Гомельской области.

Номер лота, вид выставляемого на первые повторные электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое и движимое имущество.**

**Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:**

- капитальное строение с инвентарным номером 310/С-10670 по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Химзаводская, д. 5, площадь – 8625,9 кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – здание кирпичного цеха, административно-бытовой корпус ЦКК (инв. № 9600002, 9610002), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га (право постоянного пользования). Составные части и принадлежности кап. строения: подвал, четыре пристройки, дымовая труба (кирпичная, высотой 30 м, площадь застройки 29 кв. м, инв. № 9600005), ограждение (железобетонное в железобетонных стаканах длиной 323,4 м, высотой 2,32 м, инв. № 9600004), автодороги (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию, площадь 2536 кв. м, инв. № 9600003), две площадки (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию площадью 8162 кв. м, инв. № 9600200, бетонные плиты площадью 4319 кв. м, инв. № 9600192). Капитальное строение с инвентарным номером 310/С-18687 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5, площадь – 34,1 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада масел, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га (право постоянного пользования). Ворота механические металлические; внутриплощадочные сети связи; внутриплощадочные сети канализации и водоснабжения керамические (инв. № 9600007); внутриплощадочные сети газоснабжения; внутриплощадочный теплопровод; внутриплощадочные кабельные сети в алюминиевой оболочке; электропроводка силовая до 10 КВ (инв. № 9600013); трансформатор силовой масляный мощностью 630 кВА (трансформаторная подстанция 2КТП-630, инв. № 9600015); пункт распределительный ПР 24-3104 (инв. № 9600017); пункт распределительный ПР 24-7210 (инв. № 9600018); пункт распределительный ПР 24-710 (инв. № 9600019); таль ТЭ-521 (инв. № 443414); кран мостовой грейферный (инв. № 9600119) (далее – имущество). Местонахождение имущества: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5.

Имущество, бывшее в употреблении.

**Начальная цена:** 1 994 418,00 белорусского рубля без учета НДС (освобождение от уплаты НДС согласно п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).

**Минимальная цена:** 498 604,50 белорусского рубля без учета НДС.

Размер шага составляет 5 процентов цены за лот, складывающейся в ходе электронных торгов.

**Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: 30.06.2022 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by.

Для участия в первых повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в **срок до 16.00 29.06.2022.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме 199 441,80 (сто девяносто девять тысяч четыреста сорок один рубль 80 копеек) белорусского рубля должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

**Условия первых повторных электронных торгов:** Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой рыночной оценки, и оплатить услуги ЭТП согласно прейскуранту ЭТП, заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) раб. дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов. Имущественные права на кап. строения не зарегистрированы в установленном порядке. Государственная регистрация создания кап. строений осуществляется в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» по заявлению покупателя на основании договора купли-продажи, решения собрания или комитета кредиторов об одобрении порядка и сроков продажи соответствующего имущества, технических паспортов, составленных по заявлению покупателя, и передаточных актов.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

**Справочная информация:**

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 (44) 7224795.

Контактный телефон для осмотра объектов +375 (44) 7224795.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на **http://etpvit.by** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются в соответствии с законодательством.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 11 июля 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–105) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»**

**Продавец:** коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95, Сакович Вадим Павлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 9 июня 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 7 июля 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 410/С-15943 (назначение – здание нежилое, наименование – склад), общей площадью 387,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Н.**

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 420850100001011574, площадью 0,2717 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для строительства и обслуживания склада с рампой)), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Н.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код 2.4, площадью 0,2717 га.

Начальная цена продажи лота – 50 016 руб. (пятьдесят тысяч шестнадцать рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 5 000 руб. (пять тысяч рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Волковысский филиал), 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 208, тел. 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012 0500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 23 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 21 июня 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion**

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

**К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:**

**1) здание главного корпуса, будка с колодцем, овощехранилище с составными частями в Волковысском районе, г. Волковыск, ул. Госпитальная, 11/15, 11/16, 11/1.**

Начальная цена предмета аукциона – 214 890 руб.

Размер задатка – 22 000 руб.

Аукцион состоится – **11.07.2022 г. в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **05.07.2022 г. до 16.00**.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;**
в городе Гродно **8 (0152) 62 39 11, 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31.**

Дополнительная информация размещена на сайте: **https://au.nca.by**

УНП 500042135

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый электронный аукцион по продаже:

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2010 г. в., регистрационный знак ОК-5 5673, заводской № У397032230410544 | 4540 | 18 054,00 | 1 805,00 |
| 2 | Прицеп тракторный 2ПТС-4, 1989 г. в., регистрационный знак БЭ 1475, заводской № 7953 | 8647 | 1 224,00 | 122,00 |
| 3 | Трактор гусеничный ДТ-75ЕМ, год выпуска не установлен, регистрационный знак ОК-5 5672 | 23020 | 2 754,00 | 275,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-6422, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 8305-5, рама № Y3M6422A580000778, цвет белый | 200785 | 6 426,00 | 642,00 |
| 5 | Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2011 г. в., регистрационный знак ОК-5 3151, заводской № У39ЭО32230411682 | 04541 | 33 150,00 | 3 315,00 |
| 6 | Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-6, 2009 г. в., заводской № 80 | 4631 | 7 854,00 | 785,00 |
| 7 | Плуг болотный навесной ПБН-6-50 | 119600 | 3 672,00 | 367,00 |
| 8 | Борона дисковая тяжелая Л-113 А-02 (БДТ-3) | 119461 | 4 488,00 | 448,00 |
| 9 | Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в. | 5659 | 11 322,00 | 1 132,00 |
| 10 | Агрегат дисковый навесной АДН 3.0 Р16, 2008 г. в., заводской № 132 | 23014 | 5 100,00 | 510,00 |
| 11 | Плуг полунавесной оборотный ППО-(4+1)-40КЗ без модуля, 2009 г. в. | 119458 | 6 324,00 | 632,00 |
| 12 | Борона дисковая тяжелая Л-114 А-03 (БДТ-7), 2009 г. в. | 119463 | 9 384,00 | 938,00 |
| 13 | Борона дисковая навесная мелиоративная БДН-3А, 2013 г. в., заводской № 321 | 119598 | 9 282,00 | 928,00 |

Стоимость снижена на 15 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

**Электронные торги состоятся 27 июня 2022 года в 10.00.**

**Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее *22 июня 2022 года включительно до 17.00**.**

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП).

Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY» принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

**Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321.**

**Контактные телефоны: + 375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.**

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.**

**Продавец: ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (контактный телефон +375 (029) 351 10 33).**

**Консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по 22 июня 2022 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и 13.30 до 17.00.**

**Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее 22 июня 2022 года включительно на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», назначение платежа: задаток для участия в аукционе.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by.**

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 02.03.2022, 16.04.2022, 11.05.2022.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;

- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;

- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

УНП 600077220

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15932)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Ганна ІВАНОВА:

# «Стаю зараз на сцэне... І ўсё гэта не сон!»




**На пачатку чэрвеня ў Мінску прайшоў фінал рэспубліканскага конкурсу грацыі і таленту «Каралева студэнцтва 2022», заснавальнікам якога з'яўляецца БРСМ. Найлепшай стала студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Ганна Іванова. Дзяўчына вядзе актыўны лад жыцця — займаецца творчасцю, спортам і навуковай дзейнасцю, а таксама прымае ўдзел у гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах. Ганна распавяла «Чырвонцы. Чырвонай змене» аб тым, як справілася з хваляваннем і чаму ўпэўненасць у сабе — далёка не галоўны складнік перамогі.**

***— Ужо на першым курсе ў складзе групы падтрымкі ты прымала ўдзел у конкурсах «Студэнт года» і «Каралева студэнцтва». Адкуль узнікла зацікаўленасць у такіх мерапрыемствах?***

— Я адразу вырашыла, што хачу прысвяціць сябе не толькі вучобе, але і актыўнай творчай дзейнасці. Даведалася, што на базе ВДТУ ёсць розныя калектывы, і, не разважаючы, запісалася ў студыю эстраднага танца «V.I.P.». І вось ужо на канцэрце, прысвечаным пачатку навучальнага года, разам з іншымі першакурснікамі выступіла з танцам. Хвалявалася, бо з першых дзён хацела зарэкамендаваць сябе з добрага боку. З гэтага і пачалося маё актыўнае студэнцкае жыццё. Мы ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах, рэпеціравалі пасля вучобы, а потым беглі дадому рыхтавацца да заняткаў. Я пазнаёмілася са старшакурснікамі і даведалася ад іх пра такія праекты БРСМ, як «Студэнт года» і «Каралева студэнцтва», у якіх яны тады бралі ўдзел. Мяне ўсё больш сталі цікавіць падрабязнасці, якімі ўдзельнікі з задавальненнем дзяліліся.

Пасля паездкі ў Мінск на фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года Беларусі 2020» у складзе танцавальнай групы, дзе студэнт нашага ўніверсітэта Уладзіслаў Міронычык заняў другое месца, я зразумела, што хачу паспрабаваць сябе ў гэтым мерапрыемстве. Літаральна праз некалькі месяцаў прайшоў абласны і рэспубліканскі этапы «Каралевы студэнцтва Беларусі», дзе я таксама была ў танцавальнай групе прадстаўніц ВДТУ, і было вельмі прыемна адчуць сам працэс падрыхтоўкі, а таксама ўсе перажыванні і эмоцыі ад перамог. У 2021 годзе дзве прадстаўніцы ВДТУ, Лера Фомчанка і Віка Вараб'ёва, занялі першае і другое месцы. Так напрыканцы першага курса я зразумела, што зрабіла правільны выбар і гатова далей працаваць для сябе, калектыву і ўніверсітэта.

***— Хто дапамагаў рыхтавацца да конкурсу?***

— Падрыхтоўка да «Каралевы студэнцтва Беларусі» пачалася яшчэ з універсітэцкага этапу. На рэпетыцыях адпрацоўвалася дэфіле, а гэта і прыгожая паходка, і постаць, і акцёрскае майстэрства. Работа над маўленнем, пазбаўленне ад сарамлівасці і доўгіх паўзаў для конкурсу прамоўніцкага майстэрства. І, вядома ж, работа над сабой, эмоцыямі і перажываннямі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Прафарыенцір

# ПЕДКЛАСЫ — ПРАЕКТ З ДАКАЗАНАЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦЮ

**Якія якасці, што характарызуюць індывідуальнасць настаўніка, вы лічыце найбольш значнымі: дабрыню, высокі інтэлект, акуратнасць, адказнасць, агульную культуру, маральнасць, арганізаванасць, самастойнасць, энергічнасць ці эмацыянальнасць? А якія якасці найбольш важныя для стасункаў з навучэнцамі? Любоў да дзяцей, спагадлівасць, шчырасць, тактоўнасць, цярплівасць, знешняя прывабнасць, назіральнасць, артыстычнасць... І, нарэшце, якія якасці дазваляюць педагогу ў найбольшай ступені ўплываць на іншых людзей, змяняць іх свядомасць? Мэтанакіраванасць, аўтарытэтнасць, гарманічнасць характару, прафкампетэнтнасць, добрасумленнасць, праніклівасць, самабытнасць, імкненне да творчасці... Паразважаць над гэтымі пытаннямі прапанавалі ўдзельнікам ток-шоу «Дыялог пакаленняў», які арганізавалі для навучэнцаў педкласаў адзінаццацікласніцы гімназіі Белаазёрска Ангеліна ЗАЙЦАВА, Вольга КУЛАК і намеснік дырэктара гімназіі па выхаваўчай рабоце Алена КАВАЛЕВІЧ.**

## БЕЗ ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ У ПРАФЕСІІ

Стала ўжо добрай традыцыяй збірацца кожны год у сценах Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, каб падзяліцца адно з адным сваім досведам функцыянавання педкласаў і абмеркаваць перспектывы гэтай формы прафарыентацыйнай работы.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



**Удзельнікі ток-шоу «Дыялог пакаленняў» малявалі на паперы педагога, якога чакаюць школьнікі: абстрактнага ці рэальнага.**

Майстар-клас

# ЖЫЦЦЁ І БЛОГ СА СМАКАМ МЁДУ,

## або «Шлюбны вулей» для бакфастаў



**34-гадовы пчаляр з Дрыбінскага раёна з больш чым дваццацігадовым стажам Міхаіл ГРАШЧАНКА — асоба даволі вядомая і рознабаковая: трымае пчальнік на больш чым тысячу пчаласем'яў, чытае лекцыі па пчалярстве на семінарах, навучае сваёй прафесіі стажораў, акрамя таго, вядзе YouTube-канал, дзе зараз ужо 21 тысяча падпісчыкаў. Суразмоўнік добра ведае, як зрабіць так, каб атрымліваць карысны смачны мёд і весці бізнес з добрымі вынікамі.**

— Адразу пасля нараджэння мяне забралі ў дзіцячы дом, а праз некаторы час я трапіў да апекуна. У яго быў свой пчальнік, і ён пачаў паступова ўводзіць мяне ў курс справы. Расказваў, як паводзяць сябе пчолы ў той ці іншай абстаноўцы, чым матка адрозніваецца ад трутняў, што такое вулей і гэтак далей. Мне гэта было цікава. Аднойчы мы з бацькам ставілі пасткі, і ў свой дзень нараджэння я злавіў першы дзікі рой. З таго часу і пачаўся адлік майго паглыблення ў пчалярства. І калі паўстаў выбар — ісці на якую-небудзь працу або займацца пчоламі — спыніўся на другім варыянце.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# ПЕДКЛАСЫ — ПРАЕКТ З ДАКАЗАНАЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сёлета ў міжнароднай канферэнцыі прынялі вочны ўдзел больш за 300 чалавек: педагогі і навучэнцы педагагічных класаў, спецыялісты аддзелаў і ўпраўленняў адукацыі, якія курыруюць арганізацыю профільнай педагагічнай падрыхтоўкі, навукоўцы, вядучыя спецыялісты і практыкі ў галіне профільнай і прафесійнай педагагічнай адукацыі, у тым ліку з краін блізкага замежжа: розных рэгіёнаў Расіі, Арменіі і Казахстана. Трэба заўважыць, што беларускі вопыт функцыянавання педагагічных класаў цікавіць і натхняе сёння многіх. Так, у Расійскай Федэрацыі міністрам асветы было даручана адкрыць пяць тысяч такіх класаў.

У Беларусі калісьці пачыналі са 100 педагагічных класаў, а цяпер у нас іх па краіне ўжо 556. У педагагічным профілі навучаюцца 5100 чалавек, і 30 працэнтаў з іх паступаюць пасля заканчэння школы на педагагічныя спецыяльнасці. Намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай назваў стварэнне профільных педагагічных класаў праектам з даказанай эфектыўнасцю. Менавіта ўвядзенне педагагічнага профілю ў старшых класах істотна змяніла сітуацыю з кантынгентам тых, хто паступае на педагагічныя спецыяльнасці ў ВНУ: колькасць выпадковых людзей значна зменшылася, а колькасць матываваных студэнтаў, наадварот, узрасла.

У БДПУ імя Максіма Танка атрымліваюць сёння адукацыю 744 выпускнікі профільных класаў — гэта кожны пяты студэнт дзённай формы навучання. Летась універсітэт выпусціў 110 маладых спецыялістаў, якія навучаліся ў педкласах, а сёлета дыпломы атрымаюць удвая больш былых педкласаўцаў — 220 чалавек.

## НАСТАЎНІКІ І ІХ БУДУЧЫЯ КАЛЕГІ

**Адзінаццацікласніца сталічнай гімназіі № 20 Дар'я САКАЛОЎСКАЯ** таксама два апошнія гады навучалася ў педкласе.

— Мая маці — настаўніца пачатковых класаў, бацька — выкладчык па класе духавых інструментаў у музычнай школе. Бабуля і прабабуля таксама былі педагогамі, а агульны педагагічны стаж маёй сям'і складае ўжо больш за 100 гадоў, — расказвае дзяўчына. — Таму, калі я рабіла свой выбар, родныя мяне падтрымалі. Лічу, што мая педагагічная дзейнасць распачалася яшчэ ў сёмым класе, калі мне прапанавалі стаць важатай у пяцікласнікаў. Падрыхтоўка маіх падапечных да Дня гімназіста, сумесныя паходы, экскурсіі, рэпетыцыі дазволілі не толькі адчуць сябе памочнікам класнага кіраўніка, але і спазнаць сябе. Я стала больш чулліваю, уважлівай, упэўненай, таму што даводзілася вырашаць праблемы — і чужыя, і свае, — я адчула радасць ад прыналежнасці да вучнёўскай супольнасці. А першы ўрок, які праводзіла як сапраўдны настаўнік, — руская мова ў шостым класе. Прызнаюся, я вельмі хвалявалася, хваляваўся і педагог, з якім рыхтавалася ўрока, але веды, якія мы атрымліваем у рамках факультатыўнага курса «Уводзіны ў педагагічную прафесію», мне вельмі дапамаглі. Праз пару хвілін хваляванне знікла. Маім поспехам радавалася сям'я, педагогі, а я ўсё больш пераконвалася ў тым, што здзейсніла правільны прафесійны выбар.

Яшчэ больш я ўмацавалася ў гэтай думцы, калі ў адзінаццатым класе стала ўдзельніцай агульнагімназічнага праекта «Навучэнец профільнага класа — студэнт профільнай ВНУ — настаўнік профільнага прадмета». Супрацоўніцтва са студэнтамі БДПУ, сумесная распрацоўка з імі ўрокаў і ўдзел у іх дазволілі пераканацца, што мая падрыхтоўка ў профільным педкласе часам не саступае ведам студэнтам у галінах псіхалогіі, педагогікі і метадычных аспектаў выкладання прадмета. А яшчэ хацелася б падзякаваць нашым настаўнікам профільных прадметаў, якія не толькі цярпліва дапамагаюць нам у напісанні плана-канспекта ўрока, але і кантактуюць з намі як з будучымі калегамі без перавагі, што дазваляе выяўляць праблемныя моманты ў арганізацыі ўрока без страху дапусціць памылку. Канешне, усе мы дапускаем памылкі, але пры гэтым упэўнены, што нам дадуць магчымасць іх выправіць.



У намінацыі «Лепшы маскот» перамагла работа вучаніцы 10 класа Івацэвіцкай сярэдняй школы № 1 Паліны Радзюк.

Па словах дзяўчыны, падчас навучання ў педкласе яна зразумела, што прафесія настаўніка не дазваляе стаяць на месцы, а патрабуе творчасці, самаадданасці, пастаяннага ўдасканалення прафесійных уменняў. І гэта выдатна! «Я ўпэўнена, што пройдзе зусім няшмат часу, і для мяне адчыніць свае дзверы адна з самых прэстыжных беларускіх ВНУ — Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, які будзе спрыяць прафесійнаму станаўленню, дапамагаць мне і маім равеснікам стаць сапраўднымі майстрамі ў настаўніцкай прафесіі, — кажа Дар'я Сакалоўская. — І калі я бачу, як працуюць педагогі маёй гімназіі, хочацца падхапіць і несці запалены імі факел прафесіяналізму далей...»

## «НАВУЧЫМ! ПАДТРЫМАЕМ! НАТХНІМ!»

— А для мяне дзверы БДПУ расчыніліся два гады таму, — расказвае **студэнт другога курса факультэта прыродазнаўства Андрэй РОСКАЧ, старшыня студэнцкага клуба выпускнікоў профільных класаў «ПРОФіль+»**. — Я таксама навучаўся ў педагагічным класе сярэдняй школы № 3 у Любані. Навучанне ў педкласе дало мне першы прафесійны вопыт і, галоўнае, магчымасць прыняць свядомае рашэнне аб паступленні на педагагічную спецыяльнасць. Цяпер я дакладна разумею, што менавіта ў педкласе былі закладзены асновы маёй паспяховай вучобы ва ўніверсітэце. Паколькі мы вывучалі факультатыўны курс «Уводзіны ў педагагічную прафесію», мне прасцей, чым іншым, асвойваць педагогіку і псіхалогію. Яшчэ школьнікам я праходзіў першыя педагагічныя пробы, таму цяпер мне лягчэй выконваць заданні па педпрактыцы. У школе ў мяне быў вопыт праектнай і даследчай работы, мы стваралі свае партфоліа «Я — педагог». Увогуле, лічу, што выпускнікі педкласа больш ініцыятыўныя, камунікабельныя і адказныя студэнты. З іншага боку, падчас навучання ў педкласе ў мяне было шмат сумненняў і пытанняў, напэўна, як і ва ўсіх, напрыклад, па запаўненні партфоліа, па выбары спецыяльнасці, розных нюансаў паступлення ва ўніверсітэт і вучобы ў ім. І вось тады я задумаўся, як было б здорава, калі б я мог задаць свае пытанні равесніку, які ўжо прайшоў шлях ад выпускніка педкласа да студэнта.



Сінквейн, прысвечаны прафесіі педагога, ад «маладых спецыялістаў» Дар'і Карповіч *(злева)* і Вікторыі Бельцюковай *(справа)*.

Паступіўшы ва ўніверсітэт, зразумеў, што так думаю не толькі я. Адным з тых, хто прапанаваў ідэю стварэння клуба, была студэнтка другога курса філалагічнага факультэта Дар'я Астапчук. Якужо казалі раней, сёння кожны пяты студэнт нашага ўніверсітэта — выпускнік педкласа. Таму мы вырашылі аб'яднацца і стварыць студэнцкую супольнасць, якая будзе карысная цяперашнім навучэнцам і выпускнікам педкласаў. Так сфарміраваўся клуб «ПРОФіль+». Адкуль такая назва? «Профіль» мае шмат значэнняў: профільны, прафесія, прафесіянал... Мы з вамі з'яўляемся ўдзельнікамі ўнікальнага рэспубліканскага праекта па функцыянаванні профільных педагагічных класаў. А «плюс» — гэта дабаўленне новых магчымасцяў і перспектыў.

Нашаму клубу ўжо два гады. На першай сустрэчы абмеркавалі, чым можам быць карысныя для педкласаўцаў, і вызначылі чатыры напрамкі: можам кансультаваць, навучаць натхняць і распрацоўваць. Напрыклад, адукацыйная група займаецца распрацоўкай і правядзеннем самых розных адукацыйных актыўнасцяў: прэзентацый, мітапаў, вэбінараў, семінараў і гэтак далей. Хлопцы і дзяўчаты з валанцёрскай групы арганізоўваюць для навучэнцаў педкласаў нефармальныя сустрэчы і натхняюць іх сваім прыкладам, гатовы расказваць не толькі пра радасці і складанасці студэнцкіх будняў і экзаменацыйных сесій, але і адказваць на сур'ёзныя пытанні аб прыёмнай кампаніі, падзяліцца сваёй гісторыяй паступлення. Атрымліваецца прафарыентацыйная падзея «з падвойным плюсам».

Група прасоўвання займаецца інфармацыйнай і творчай падтрымкай, нашай прысутнасцю ў сацыяльных сетках і гэтак далей.

Летась мы вырашылі падтрымаць выпускнікоў педкласаў, якія паступаюць па сумоўі без экзаменаў, і арганізавалі для іх «Зону «ПРОФільнай» падтрымкі» — месца, дзе абітурыенты могуць пагутарыць з нашымі валанцёрамі, пракансультавацца наконт праходжання такой гутаркі і прэзентацыі свайго партфоліа. Спадзяёмся, што гэта дапамагло ім адчуць сябе больш упэўнена. У перыяд уступнай кампаніі бягучага года члены клуба вырашылі зноў забяспечыць маральную і кансультацыйную падтрымку выпускнікам педкласаў, якія паступаюць у наш універсітэт.

Для нас, студэнтаў БДПУ, удзел у клубе — гэта новы, ужо прафесійны вопыт, магчымасць прапампаваць свае камунікатыўныя навыкі, уменні выбудоўваць адносіны, супрацоўнічаць, узаемадзейнічаць, працаваць у камандзе.

У клуба «ПРОФіль+» ёсць свой мерч: календары, блакноты, ручкі, цішоткі, кепкі з лагатыпам клуба. У гэтым годзе сумесна з Цэнтрам неперарыўнай педагагічнай адукацыі быў аб'яўлены конкурс на маскот (талісман клуба) і слоган. Усяго было даслана 113 распрацовак. Пераможцай у намінацыі «Найлепшы слоган» стала Дар'я Буйко, дзесяцікласніца сярэдняй школы № 1 з гарадскога пасёлка Шаркаўшчына, са слоганам «ПРОФіль+: Навучым! Падтрымаем! Натхнім!». А ў намінацыі «Найлепшы маскот» перамагла вучаніца 10 класа Івацэвіцкай сярэдняй школы № 1 Паліна Радзюк.

## ПАРТРЭТ ІДЭАЛЬНАГА ПЕДАГОГА

Для навучэнцаў і студэнтаў-выпускнікоў педагагічных класаў у рамках канферэнцыі былі арганізаваны разнастайныя крэатыўныя мерапрыемствы прафарыентацыйнай накіраванасці. Многія з іх правялі самі навучэнцы. Як, напрыклад, ток-шоу «Дыялог пакаленняў». Як заўважыла намеснік дырэктара гімназіі Белаазёрска Алена Кавалевіч, у школу часта запрашаюцца прадстаўнікі розных прафесій. Яны хочуць быць цікавымі і карыснымі, але не ведаюць, як гэта зрабіць, асабліва калі ад удзельнікаў сустрэчы не паступае пытанняў. Каб гасцей разняволіць, трэба сур'ёзна рыхтавацца. Такая форма работы, як ток-шоу, дазваляе прайсці на практыцы некаторыя тэмы факультатыва, што вывучаецца ў педкласах.

**Гасцямі ток-шоу сталі «маладыя настаўнікі», роля якіх дасталася Дар'і КАРПОВІЧ, вучаніцы дзясятага класа мінскай гімназіі № 174, і Вікторы БЕЛЬЦЮКОВАЙ, адзінаццацікласніцы сярэдняй школы № 2 г. п. Смілавічы Чэрвенскага раёна.** Нававспечаным «маладым спецыялістам» прапанавалі прайсці па «зорнай дарожцы», паўдзельнічаць у бліц-апытанні, адказваючы на шэраг пытанняў. Напрыклад, што вас засмучае ў цяперашніх дзецях? Ці часта вы самі спазняліся на ўрокі, калі былі школьнікамі? Калі вам дрэнна, як вы спраўляецеся з гэтым станам? А як ставіцеся да шпаргалак і ЦТ? Прыгадайце самы смешны выпадак з вашага школьнага жыцця...

**Менавіта ўвядзенне педагагічнага профілю ў старшых класах істотна змяніла сітуацыю з кантынгентам тых, хто паступае на педагагічныя спецыяльнасці ў ВНУ: колькасць выпадковых людзей значна зменшылася.**

Потым усе разам спрабавалі апісаць тыповы дзень педагога, выкарыстоўваючы толькі назоўнікі, малявалі на паперы педагога, якога чакаюць школьнікі: абстрактнага ці рэальнага. Разбуралі міфы вакол настаўніцкай прафесіі. Склалі партрэт ідэальнага педагога. Вердыкт аўдыторыі: **ідэальны педагог — добры, мэтанакіраваны і любіць дзяцей! Гэта чалавек, які заўсёды зможа дапамагчы, вырашыць любую праблему і стане для цябе сябрам!** Вішанькай на торце стала заданне для «маладых спецыялістаў» скласці сінквейн наконт сутнасці прафесіі настаўніка. Сінквейн — гэта метадычны прыём, які ўяўляе сабой складанне верша з пяці радкоў. У яго ёсць свае законы. Першы радок верша — яго тэма. Яна павінна быць прадстаўлена ўсяго адным словам і абавязкова назоўнікам. Другі радок складаецца з двух слоў, якія раскрываюць асноўную тэму. Гэта павінны быць прыметнікі. Трэці — тры дзеясловы, якія характарызуюць дзеянні па дадзенай тэме. Чацвёрты радок — словы, пры дапамозе якіх выказваецца стаўленне да тэмы. І пяты радок — усяго адно слова, якое ўяўляе сабой нейкі вынік, рэзюмэ. У «маладых педагогаў» атрымаўся наступны сінквейн «Педагог. Адукаваны і добры. Любіць, вучыць, аддаваць. Адказны, мэтанакіраваны, цярплівы. Веды».

Да старту прыёмнай кампаніі застаюцца лічаныя дні. Вікторыя Бельцюкова марыць стаць настаўніцай пачатковых класаў. Яна проста абажае дзяцей. І вельмі хочацца, каб у яе ўсё атрымалася, а клуб «ПРОФіль+» займе яшчэ аднаго крэатыўнага і ініцыятыўнага сябра.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара і БДПУ.**

# ЖЫЦЦЁ І БЛОГ СА СМАКАМ МЁДУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Міхаіл кажа, што для пчол трэба, каб па перыметры пчальніка быў пылок і нектар.

— Тэрыторыя нашай краіны, можна сказаць, уся залітая нектарам. Гэта мала зараз выкарыстоўваюць, але спадзяюся, што ў будучыні сітуацыя зменіцца. Важна, каб каля пчол не было зайздрасці. Да іх варта ставіцца як да сябра, і тады будзе аддача. Пчалярства — гэта цяжкая праца, ад захаду сонца да світання, і патрабуе пунктуальнасці. Каманда вельмі важная ў такой справе: адзін не зможаш доўга трымаць шматлікія сем'і пчол. У нас працуе пяць чалавек: я, жонка, брат і некалькі іншых спецыялістаў. Мы займаемся шматвектарным пчалярствам: ад продажу пчол да мёду. Працоўныя дні не падобныя адзін да аднаго. Летась сабралі каля 15 тон мёду, але гэта не мяжа. На гэты сезон плануем узяць больш. Калі падумаеш: пачынаў пчалярства ўсяго з аднаго вулля, а зараз трымаем больш за тысячу пчаласем'яў. Крута!

Першы яго вулей пяць гадоў таму пагніў, і пчальнік загінуў... «Паўстаў выбар: або кінуць гэтую справу і заняцца чымсьці іншым, або аднавіць усё, залазячы ў даўгі. Я выбраў другі варыянт — і не пашкадаваў пра гэта ні разу. Не разгубіўся: самастойна з камандай мы зрабілі новы вулей з падсобных матэрыялаў, які стаіць і дагэтуль. Паабяцаў сам сабе, што ў будучыні падару яго свайму сыну», — падзяліўся герой.

Замест звычайных вулляў у Міхаіла стаіць нуклеусны парк. Нуклеус — міні-вулей, у якім утрымліваецца невялікая калонія пчол. У Германіі, напрыклад, ён завецца «шлюбным вуллем». Нуклеусы, устаноўленыя адзін на аднаго, нагадваюць канструктар. У ім адбываецца апладненне матак. Такая тэхналогія дапамагае атрымліваць максімальную выгаду пры мінімальных выдатках.

— Ужо больш за восем гадоў мы працуем з парадай пчол «бакфаст». Гэта прадказальная пчала, вельмі працавітая, міралюбівая, добра пераносіць зіму. Матка вонкава адрозніваецца ад астатніх асобін і выконвае адну функцыю: адкладае яйкі, з якіх развіваюцца і працоўныя пчолы, і трутні, і маладыя маткі. У натуральных умовах яна спарваецца з трутнямі толькі ў паветры. А ў нас ёсць свая лабараторыя, дзе ўстаноўлены чатыры мікраскопы і іншае абсталяванне. Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасць весці ў чысціні лініі і пароды пчол, захоўваем і аднаўляем генафонд. За сезон каля тысячы пчаламатак з нашага пчальніка рассылаюцца па ўсёй постсавецкай прасторы і ў Еўропу. Адпраўляем іх у пластмасавых скрынках з празрыстай накрыўкай. Зразумела, каб дабіцца такіх вынікаў, мне спачатку прыйшлося шмат вывучаць спецыялізаваную літаратуру, наведваць розныя майстар-класы і лекцыі ад прафесіяналаў у гэтай сферы, а цяпер ужо мы дзелімся сваім вопытам і ведамі з іншымі зацікаўленымі ў пчалярстве.

> **«Важна, каб каля пчол не было зайздрасці. Да іх варта ставіцца як да сябра, і тады будзе аддача».**

Суразмоўнік падкрэсліве: галоўнае — ставіцца да справы з любоўю. «На працягу свайго доўгага шляху я рабіў памылкі ў працы і раблю іх дагэтуль. Лічу, што, калі не памыляешся, — не расцеш.



Зразумела, з цягам часу становішся больш асцярожным. Напрыклад, раней мяне пчолы маглі пакусаць 30 разоў на дзень, зараз жа — два-тры» *(усміхаецца)*.

На YouTube-канале Міхаіла 21 тысяча падпісчыкаў. Што цікавіць і падабаецца яго аўдыторыі? — пытаюся ў суразмоўніка.

— Майму каналу больш за дзевяць гадоў. У 2016 годзе прыехаў сябар і зняў пра мяне відэа «Прамысловы пчальнік: ад «А» да «Я». Убачыў, што шмат хто адгукнуўся на гэтую тэму, таму і завёў свой канал. На ім дзялюся вопытам, распавядаю, як зрабіць правільна і чаго не трэба рабіць, каб захаваць і прымножыць вынікі ў пчалярстве. Увесь кантэнт з камандай здымаем на мабільны тэлефон. Нешта спрабуем самі — і толькі пасля паказваем гледачам. Некаторыя пчаляры кажуць: навошта ты паказваеш і распавядаеш, што на такой дзейнасці можна добра зарабляць? А я ганаруся, што я — пчаляр, мне мой занятак па душы. Калі ёсць канкурэнцыя ў прафесіі — гэта вельмі добра. Людзі павінны ведаць: пчалярства можа карміць усё жыццё і вас, і вашых дзяцей. Яно дае незалежнасць ва ўсім. Штомесяц мне прыходзяць дзясяткі лістоў з розных краін з падзякамі за тое, што мой вопыт мяне жыццё іншых у лепшы бок. Мяне запрашаюць у якасці спікера на семінары, майстар-класы, у сябе таксама праводзім навучальныя курсы. Да мяне прыязджаюць стажоры.

Дарэчы, у свой час уся вёска адгаворвала Міхаіла ісці вучыцца на пчаляра. Маўляў, гэта несур'ёзны і неперспектыўны занятак...

— Я паслухаў іншых і пайшоў вучыцца ў сферу лясной гаспадаркі. Але пасля завочна адвучыўся на пчаляра. Зразумеў, што памыліўся, — трэба было адразу слухаць толькі сябе і сваё жаданне. Пасля таго як адвучыўся, ажаніўся, чатыры гады мы з сям'ёй пражылі ў горадзе, але пасля перабраліся ў вёску і тут адчуваем сябе цалкам камфортна. Кажуць, што ў горадзе больш магчымасцяў, я ж лічу, што ў вёсцы іх таксама шмат. Калі хочаш штосьці пачаць з нуля, вёска — добрае для гэтага месца. Тут ніколі не застанешся галодным, галоўнае — не ленавацца. Не буду прымушаць свайго сына займацца пчалярствам, але прыкладу максімум намаганняў, каб яго гэта справа захапіла.

**Дар'я ЕЎСЯВІЦКАЯ.**
**Фота з архіва героя.**

*Лакацыі актыўнасці*

# Студатрадаўская рамантыка пад перастук колаў

**Беларуская чыгунка і БРСМ падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Мэта дакумента — фарміраванне і прыцягненне студэнцкіх атрадаў для работы ў арганізацыях магістралі.**

Беларуская чыгунка ўжо мае станоўчы вопыт па арганізацыі студэнцкіх атрадаў з ліку навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа чыгуначнага транспарту імя Я. П. Юшкевіча і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту для работы ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі.

Сёлета сэрвісныя і будаўнічыя студэнцкія атрады будуць сфарміраваны ў вагонных участках і дыстанцыях пуці Мінскага і Гомельскага аддзяленняў Беларускай чыгункі. Гэта каля дзесяці атрадаў, у якіх будзе задзейнічана больш за сто студэнтаў і навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Яны будуць працаваць праваднікамі пасажырскіх вагонаў і манцёрамі пуці. Акрамя таго, будуць створаны два педагагічныя студэнцкія атрады з ліку навучэнцаў Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа імя Л. С. Выгоцкага, якія будуць працаваць выхавальнікамі ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Лясныя далі» Гомельскага аддзялення дарогі. У 2023 годзе плануецца, што такія атрады будуць створаны і на іншых аддзяленнях БЧ.

Кіраўніцтва Беларускай чыгункі падтрымлівае ініцыятыву больш шырокага прыцягнення студэнцкіх атрадаў для работы ў арганізацыях магістралі і спадзяецца, што супрацоўніцтва з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі будзе актыўна гэтаму садзейнічаць. Студэнцкія атрады адыгрываюць вялікую ролю ў забеспячэнні занятасці моладзі, уцягванні яе ў сацыяльна-эканамічнае жыццё грамадства, фарміраванні ў маладога пакалення актыўнай грамадзянскай пазіцыі і пачуцця патрыятызму. Работа ў студатрадзе садзейнічае не толькі прафесійнаму развіццю, набыццю працоўнага вопыту, але і рэалізацыі інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу маладых людзей, вучыць іх уменню працаваць у камандзе, развівае пачуццё асабістай і калектыўнай адказнасці за вынікі сваёй працы.

Удзел у студэнцкіх атрадах уключае забеспячэнне занятасці моладзі з розных рэгіёнаў краіны, прадугледжвае культурную, спартыўную, экскурсійную праграму, а таксама спаборніцтвы па вытворчых паказчыках. Адбор навучэнцаў і студэнтаў у студэнцкія атрады вядзецца на конкурснай аснове.

Сімвалічна, што падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларускай чыгункай і Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі адбылося ў год 160-годдзя беларускай магістралі і 20-годдзя ГА «БРСМ».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Камертон настрою*

# САГРЭЕ ДАРАГІ АРНАМЕНТ НА АДЗЕННІ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і канцэрн «Беллегпрам» запрашаюць таленавітых маладых людзей, якія займаюцца дызайнам, мадэляваннем і канструяваннем адзення, прыняць удзел у новым рэспубліканскім конкурсе эскізаў дызайну вырабаў і сувеніраў з выкарыстаннем элементаў дзяржаўнай сімволікі, беларускага арнамента і культурных сімвалаў «За любімую Беларусь!».**

У конкурсе могуць прымаць удзел дызайнеры-аматары, навучэнцы і студэнты, якія атрымліваюць прафесію ў галіне лёгкай прамысловасці, а таксама дызайнеры-прафесіяналы.



Фота з сайта БРСМ.

У якасці конкурсных работ прымаюцца эскізы мадэляў адзення, аксесуараў і сувеніраў для выкарыстання ў паўсядзённым жыцці, выкананыя па апошніх тэндэнцыях моды з элементамі і колерамі дзяржаўнай сімволікі Беларусі, якія адлюстроўваюць сучасны погляд і крэатыўнае рашэнне. Эскізы могуць быць выкананы ў любой тэхніцы, з апісаннем мадэлі, у фармаце А4 ці А3. Вітаецца творчы пошук і наватарства.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе разам з эскізамі можна даслаць да 20 жніўня на электронны адрас: brsm@inbox.ru (электронны варыянт) альбо на адрас: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 40, Рэспубліканскі дом моладзі, аддзел праектнай дзейнасці ЦК БРСМ з пазнакай «У ОПД — Конкурс вырабаў» (арыгінальны варыянт). Кантактны тэлефон для растлумачэння ўзніклых пытанняў — 8 (017) 222 31 46.

У заяўцы неабходна ўказаць: прозвішча, імя, імя па бацьку дызайнера работы, намінацыю, у якой ён жадае ўдзельнічаць, навучальную ўстанову (цалкам) / месца працы (пасада), нумар кантактнага тэлефона, электронны адрас, невялікую інфармацыю аб тым, што натхніла на стварэнне эскіза, а таксама аб асаблівасці мадэлі (дызайн, сімвалічнасць, аздабленне, колеравае рашэнне).

Вынікі праекта плануецца падвесці ў другой палове верасня па наступных намінацыях:

«Найлепшая дызайнерская прапанова камплекта адзення для моладзі (мужчынская і/або жаночая) з айчынным сыравінай з выкарыстаннем элементаў дзяржаўнай сімволікі Беларусі»; «Найлепшы дызайн касцюма (стыль «экалагічны»)»; «Найлепшы дызайн (любы выраб), прымеркаваны да Года гістарычнай памяці»; «Найлепшы дызайн сувенірнай прадукцыі»; «Найлепшы арыгінальны дызайн».

Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі і запрошаны на прэзентацыю сваіх распрацовак на 46-ю Міжнародную выставу па аптовым продажы тавараў лёгкай прамысловасці BelTEXIndustry-2022. Акрамя таго, на выставе маладыя таленты змогуць атрымаць магчымасць рэалізацыі сваіх конкурсных работ на прадпрыемствах «Беллегпрама», а таксама сумесна з БРСМ у рамках тэматычных праектаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 06 2022 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# І «ВУСНЫ ВАФЕЛЬКАЙ»...

**Трэнды ў сучаснай модзе і касметалогіі зараз змяняюцца настолькі імкліва, што паспець за імі проста немагчыма. Таму і не будзем сабе ставіць такую задачу, а проста прыгадаем, што было «цікавага» за апошні час. Напрыклад, вы, магчыма, ведаеце, што «вусны качачкай» ужо не ў фаворы? («— Ну навошта ты зноў так губкі надзьмула, яны ж у цябе сіліконавыя, могуць лопнуць!») Больш за тое, адышла мода і на «вусны д'ябла», калі дзяўчаты і жанчыны рабілі хвалю на верхняй губе — такі варыянт называўся «медуза», «асьміног» ці тыя самыя «вусны д'ябла». Жаданы эфект дасягаўся пры дапамозе прэпаратаў, якія ўводзілі побач з краем вуснаў, тым самым змяняючы іх контур. («Іра так моцна павялічыла губы, што на вусы перасталі звяртаць увагу».)**

Дык і гэта ўжо ўчарашні дзень! Нават не ведаю, праўда гэта ці фэйк, інфармацыі няшмат... Але зараз такое часам адбываецца, што і не такому паверыш... Карацей, ёсць нешматлікія згадванні пра «вусны вафелькай». Ну, вы ж гэты кандытарскі выраб бачылі, памятаеце, якая ў яго паверхня? Можна яшчэ батон варанай каўбасы прыгадаць, калі з яго здымаюць вяровачкі, якімі ён абкручаны. Уявілі відовішча? («— Дачка, і куды ж ты сабралася ў такім выглядзе? А гэтыя вусны ўвогуле памадай фарбаваць не прынята!») Але чаму, калі былі «вусны качкай», дык не можа быць «вуснаў вафелькай»? Хто яго ведае...

Больш даверу новаму трэнду, які, як мяркуецца, стане модным сёлета: так званыя «пандэмійныя», або размазаныя, вусны. Пра іх яшчэ гавораць так: пад маскай усё роўна не відаць. («Скажыце, а хтосьці з такім ужо сутыкаўся? Калі ў масцы зламаўся дроцік на пераноссі — гэта ўжо ўсё ці яшчэ нешта можна зрабіць?») Пандэмія нечакана паўплывала на трэнды ў макіяжы. За апошнія два гады жанчыны прывыклі больш увагі аддаваць вачам і бровам. Візажысты лічаць, што прыйшоў час заняцца і вуснамі. Яны прапануюць вярнуць у моду «зацалаваныя вусны» і крыху мадыфікаваць іх. (Аб'ява: «Павелічэнне грудзей, вуснаў, ягадзіц. Без усялякіх аперацый, нядорага. Спытаць пчаляра дзядзьку Федзю».) Эфект зацалаваных вуснаў — гэта такое нанясенне памады, што здаецца, быццам частку яе ўжо «з'елі». Вусны зараз можна фарбаваць не так акуратна і сіметрычна, але і за контур выходзіць не варта. У 2022 годзе яны павінны выглядаць так, быццам вы хадзілі ў масцы, а памада адбілася на ёй і страціла інтэнсіўнасць. («Хвіліна маўчання за тых жанчын, якія напампавалі вусны за дзве тысячы еўра, а цяпер мусяць насіць маску за адзін еўра».) Мне толькі не зусім зразумела: навошта ўсе гэтыя выкрунтасы, калі пад маскай нічога не відаць?



Вось іншая справа. Брытанскі модны дом Burberry прадставіў адкрытую рэч на анлайн-паказе і падвергся крытыцы ў сацыяльных сетках. Гаворка ідзе аб трэнчы бэжавага колеру з выразам на спіне, які цалкам агаляе ягадзіцы мадэлі. («— Ну, канешне, гэта Гучы! Прымярайце — станавіцеся на кардонку, а я пакуль шторку патрымаю!») Карыстальнікі сеткі паднялі на смех плашч брэнда, палічыўшы яго дызайн недарэчным. «Пра што думаў дызайнер, калі прыдумляў гэты трэнч? Смяюся ў голас», «Рыкарда проста адарваў кавалак плашча», «Як яму прыйшло гэта ў галаву — проста трызненне», «Якой жа дзіўнай стала мода», — выказваліся юзэры. («Я сам сябе проста так не хвалю. Вось такі я малайчына!»)

А што, гэта вам не Паўночная Карэя. Там Кім Чэн Ын забараніў сваім грамадзянам насіць скураныя плашчы, каб яны не маглі паўтарыць яго культавы вобраз. Сам правіцель насіў скураныя курткі, забароненыя ў краіне, таму што людзі пачалі яго капіраваць, і была ўведзена забарона. Кажуць, нават створана спецыяльная «модная» паліцыя, каб сачыць за яе выкананнем, бо, як той казаў, не трэба замахвацца. Але ў гэтым месяцы мы жартаваць не будзем...

А вось вам яшчэ крыху «аголенкі». Раней іншы дызайнер і экаактывіст увёў у моду дзіравыя шкарпэткі, чым вельмі ўсіх развесяліў. Японскі мадэльер Такаюкі Фукудзава патлумачыў, што, на яго думку, калі рванае адзенне стане трэндавым, то будзе служыць уладальніку даўжэй, паколькі яму не давядзецца яго выкідваць. («— Вася, як табе не сорамна? Ты прыйшоў у госці ў дзіравых шкарпэтках?! — «Гэта не дзіркі». — «А што тады?» — «Дэкальтэ!»)

Ну, што, «апрануліся па модзе»? «Макіяж» зрабілі? А, яшчэ ж аксесуар патрэбны! Модны брэнд Bottega Veneta прадставіў каралі, якія нагадваюць перакручаны тэлефонны провад. («— Чужыя рукі цябе лашчаць, чужыя губы шэпчуць табе...» — «Калі я правільна разумею, iPhone ў цябе ўкралі?») Міленіялы такія штукі ўжо не памятаюць, таму разлік менавіта на іх. Самае цікавае, што такое будуць браць, сцвярджаюць эксперты. Не, не з-за прыгажосці. Тут хутчэй справа ў арыгінальнасці і іроніі з сябе і свету. Калі нейкае забытае і бескарыснае старое раптам можа мець вялікую каштоўнасць, амаль як арт-аб'ект. («— Вы ў парадку?» — «Так, у выпадковым».)

...Цяпер гатовы? Масачку я ўсё ж прыхапіў бы. Тады — «вусны вафелькай» — і наперад?.. Як парадзіравала аднайменную песню каманда КВЗ «ДАЛС»: «У вуснаў тваіх цукерачны, цукерачны смак...»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Стаю зараз на сцэне... І ўсё гэта не сон!»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

З усім гэтым мне дапамагалі спраўляцца мая кіраўніца Алеся Анатольеўна Чыслова, якая ўсяліла веру і ўпэўненасць, сябры, падтрымка якіх адчувалася літаральна кожную секунду, харэографы, якія адточвалі са мной кожны рух. Кіраўніцтва ўніверсітэта, дэканат і выкладчыкі шчыра верылі ў мяне і падтрымлівалі нават на адлегласці. Уклад унеслі і прадстаўнікі БРСМ. Асобны «дзякуй» арганізатарам і рэжысёрскай групе за тое, наколькі прафесійна, творча і з любоўю яны падыходзяць да сваёй працы. І, вядома ж, велізарныя словы падзякі бацькам, якія пражывалі са мной усе цяжкасці і страхі, падзялялі радасць ад перамог, верылі ў мяне і атулілі любоўю і клопатам

**«Напрыканцы першага курса я зразумела, што зрабіла правільны выбар і гатова далей працаваць для сябе, калектыву і ўніверсітэта».**

***— Які конкурсны нумар стаў для цябе самым важным?***

— Выдзеліць нешта адно складана. Кожнае з выступленняў прэзентуе ўдзельніцу па-рознаму. У дэфіле раскрываецца зграбнасць, лёгкасць, павольнасць. Прамоўніцкае майстэрства дазваляе ацаніць вобразнасць маўлення і арыгінальнасць падачы матэрыялу. А творчы конкурс дэманструе твой найлепшы навык або любімае хобі і, канешне, ты атрымліваеш задавальненне на сцэне ад таго, што займаешся любімай справай.

**«Пасля аб'яўлення вынікаў мяне накрылі эмоцыі радасці, шчасця, гонару».**

***— Ганна, што ты адчула, калі цябе абвясцілі пераможцай?***

— Пасля аб'яўлення вынікаў мяне накрылі эмоцыі радасці, шчасця, гонару. Гэта ўсведамленне таго, што, прайшоўшы такі шлях, я дамаглася ганаровага тытула, стаю зараз на сцэне перад шматлікімі гледачамі, перад сваёй групай падтрымкі, роднымі, а за кулісамі — мая кіраўніца, якая адчувае тое ж. І ўсё гэта не сон. Побач стаяла студэнтка нашага ўніверсітэта Лера Фомчанка, яна перадала мне карону «Каралевы студэнцтва», якую я прывязу назад у нашу ВНУ. У той момант разумееш, што дзеля гэтага варта працаваць і нішто не заменіць такіх пачуццяў.

***— Якая атмасфера панавала сярод канкурсантак? Ці паспелі пасябраваць?***

— Знаёмства з удзельніцамі адбылося яшчэ да фінальнага тыдня падрыхтоўкі да конкурсу. Калі мы на два дні прыязджалі ў Мінск, было відаць, што стасункі больш наладжаны ў мікрагрупах. Гэта зразумела, бо некаторыя былі знаёмы яшчэ з абласнога этапу. Аднак да канца першага дня стала зразумела, што ўсе дзяўчынкі таварыскія, пазітыўна настроены і адкрыты да камунікацыі. За тыдзень падрыхтоўкі да конкурсу мы даведаліся столькі цікавых і унікальных фактаў адзін пра аднаго! З кожным днём мы збліжаліся, і ў цяжкія моманты кожная была гатова дапамагчы, выручыць і падтрымаць. Падчас фіналу мы абняліся і пажадалі проста атрымаць задавальненне ад выхаду на сцэну, ад працы і ад атмасферы ў зале.

***— Ёсць меркаванне, што для таго, каб удзельнічаць у такіх конкурсах, трэба валодаць вельмі высокай самаацэнкай і быць упэўненай у сабе асобай. Ці згодная ты з гэтым? А яшчэ якую параду ты магла б даць дзяўчатам і хлопцам, якім не хапае ўпэўненасці, каб рэалізаваць свой патэнцыял?***

— Не зусім. Безумоўна, гэта адыгрывае нейкую ролю, але мінімальна. Упэўненасць нараджаецца дзякуючы плённай працы, падтрымцы блізкіх і разуменню, што цябе любяць. А каб не саромецца, уяўляйце нешта прыемнае або каго-небудзь з блізкіх. Я, напрыклад, думала пра маму, і на твары адразу з'яўлялася шчырая ўсмешка.

**«З кожным днём мы збліжаліся, і ў цяжкія моманты кожная была гатова дапамагчы, выручыць і падтрымаць».**

***— Зараз ты вучышся на другім курсе факультэта эканомікі і бізнес-кіравання. Ужо разважала, з якой сферай звяжаш жыццё?***

— У мяне няма канкрэтных планаў пасля заканчэння ўніверсітэта. Ёсць думка аб паступленні ў магістратуру. Разумею, што жыццё больш складанае і варыятыўнае, чым мы можам уявіць, і з кожным днём усё мяняецца, прагрэс не стаіць на месцы. Ужо неактуальна быць прафесіяналам у вузкай сферы, за выключэннем некаторых спецыяльнасцяў. Зараз важна развівацца ў розных напрамках, быць амбіцыйным і гатовым да перамен.

***— Ганна, што падабаецца ў студэнцкім жыцці больш за ўсё?***

— Магу сказаць, што гэта самы яскравы і цікавы перыяд у жыцці, пастаянны рух, калі ты знаёмішся з мноствам людзей, вучышся новаму і, вядома ж, знаходзіш сяброў.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БРСМ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 8.06.2022 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)**
**по поручению антикризисного управляющего ООО «Правовая Стратегия»**
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)
**проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве)**
**на основании Решения Экономического суда Минской области от 02.11.2021 по делу № 156Б2142**
**повторный открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Молодечненский завод металлоизделий»**
(222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Промышленная, 4, УНП 600066567) **в составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена (без НДС), бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Подстанция *(составные части и принадлежности: кабельная линия (алюминиевая оболочка))*, инв. № 630/С-45414, общей площадью 38,8 кв. м; котельная новая *(составные части и принадлежности: склад красок)*, инв. № 630/С-45429, общей площадью 535,1 кв. м; здание трансформаторной подстанции, инв. № 630/С-74599, общей площадью 83,8 кв. м; трансформатор силовой ТМЗ-630/10, 1992 года выпуска, зав. № 364162, инв. № 611, трансформатор силовой ТМ-400/10/0,4, 1980 года выпуска, зав. № 107668, инв. № 612, трансформатор силовой ТМ-400/10/04, 1985 года выпуска, зав. № 107666, камеры КСО-272, 1986 года выпуска в количестве 14 (четырнадцати) штук | 41 390,00 | 4 139,00 |
| 2 | Сварочный (токарно-штамповочный) цех *(составные части и принадлежности: металлическая холодная пристройка, кирпичная холодная пристройка, металлический сарай)*, инв. № 630/С-45434, общей площадью 947,8 кв. м; компрессор 1ВВ-10/8, инв. № 605, компрессор 2ВМ 2,5-12/9, инв. № 606, компрессорная станция (компрессор ВП 2-10/9М, компрессор 202ВП-10/8, 2 воздухозаборника 6,3 куб. м и 10 куб. м), 1972 года выпуска), машина точечной сварки МТР-280, инв. № 13-030 | 69 600,00 | 6 960,00 |
| 3 | Здание склада химии, инв. № 630/С-74598, общей площадью 67,9 кв. м, уборная, инв. № 016 | 6 200,00 | 620,00 |
| 4 | Центральная проходная *(составные части и принадлежности: ограждение, ворота)*, инв. № 630/С-45441, общей площадью 46,8 кв. м | 17 300,00 | 1 730,00 |
| 5 | Склад металла *(составные части и принадлежности: металлический навес, металлический центральный склад)*, инв. № 630/С-45412, общей площадью 679,9 кв. м, стеллажная эстакада, инв. № 018 | 32 400,00 | 3 240,00 |
| 6 | Изолированное помещение (помещение гальванического участка) (составные части и принадлежности: пристройка), инв. № 630/D-47184, общей площадью 427,3 кв. м; изолированное помещение (помещение сборочного участка, инв. № 630/D-29942, общей площадью 382,4 кв. м | 68 740,00 | 6 874,00 |
| Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 642000000002000542 площадью 2,4130 га (общее долевое право аренды по 21.02.2112, доля 1971/5000) по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4. *Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0345 га* | | | |
| 7 | Станок токарно-винторезный 163, 1971 года выпуска, заводской № 39156, инвентарный № 01-006 | 3 700,00 | 370,00 |
| 8 | Станок токарно-винторезный SN-401+1500, 1983 года выпуска, инвентарный № 01-010 | 4 800,00 | 480,00 |
| 9 | Станок радиально-сверлильный 2Н55, 1970 года выпуска, заводской № 727, инвентарный № 02-009 | 5 000,00 | 500,00 |
| 10 | Станок универсально-заточный 3Е642Е, 1988 года выпуска, заводской № 1249, инвентарный № 03-018 | 3 600,00 | 360,00 |
| 11 | Станок консольно-фрезерный вертикальный 6М12П, 1971 года выпуска, заводской № 1611, инвентарный № 06-012 | 2 400,00 | 240,00 |
| 12 | Полуавтомат для накатки резьбы UPW 12,5+70, 1988 года выпуска, инвентарный № 09-015 | 2 550,00 | 255,00 |
| 13 | Пресс гидравлический листогибочный ПЛГ-01.000.00 ПС, 2010 года выпуска, инвентарный № 26-032 | 5 850,00 | 585,00 |
| 14 | Пресс листогибочный кривошипный ИТ1330В, 2011 года выпуска, заводской № 49, инвентарный № 3056 | 25 450,00 | 2 545,00 |
| 15 | Станок круглошлифовальный 3Б153, 1971 года выпуска, заводской № 1344, инвентарный № 03-003 | 1 850,00 | 185,00 |

**Начальная стоимость лотов №№ 1–5, 7–15 снижена на 50 %.**

**Начальная стоимость лота № 6 снижена на 30 %.**

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Промышленная, 4.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются не позднее дня окончания приема документов на аукцион на р/с № BY55BPSB301210 82600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона возмещает затраты на публикацию и оплачивает вознаграждение организатору аукциона в следующем размере: по лотам №№ 1, 2, 4, 5, 6, 14 – в размере 5 % от цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 3, 7–13, 15 – в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона.**

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-3 «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и размещен на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оформляются в виде протокола в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 25.11.2021, 28.01.2022, 29.03.2022.

Аукцион состоится **24.06.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.06.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра (8029) 685-36-77.**

УНП 600066567

---

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-41604 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 345,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 13.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000007000046, площадью 0,1719 га (назначение – для обслуживания магазинов), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 13 (доля в праве на земельный участок 1135/1719). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадью 0,1719 га

Начальная цена продажи – 477 000 руб. (четыреста семьдесят семь тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 47 700 руб. (сорок семь тысяч семьсот рублей).

ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6. Тел. 8-0154-617-577, факс 8-0154-522-540

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 2 % от конечной цены продажи объекта
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083322 5001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 08 июля 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 06 июля 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества ГОУПП «Гродненская типография» (УНП 500013667), объявляет о проведении **21.06.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

УНП 193417684

---

Извещение о проведении **23 июня 2022 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 500/С-41939 общей площадью 668,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/1, наименование – литер Б1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41940 общей площадью 635,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер А1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41941 общей площадью 289,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/2, наименование – здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение* с инв. номером 500/С-41942 общей площадью 201,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/3, наименование – литер Г1/бл. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,8374 га, кадастровый номер – 500000000004002829 | 1 018 560,00 | 101 000,00 |
| 2 | Капитальное строение* с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути | Площадь – 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710 | 498 240,00 | 49 000,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина №61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети; капитальное строение** с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | 1 826,89 | 180,00 |
| 4 | Капитальное строение*** с инв. номером 640/С-68377 общей площадью 337,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 94А, наименование – торгово-производственный комплекс, назначение – здание многофункциональное, составные части и принадлежности – торгово-производственный комплекс А1/к с двумя пристройками 1, 2, складом 3, дорожка а, дворовое покрытие б, калитка в, ворота г, забор д | Площадь – 0,2462 га, кадастровый номер 642500000001000231 | 303 600,00 | 30 000,00 |
| **Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется проведение осмотра** | | | | |

** Ограничения (обременения): аренда до 30.06.2022 г.*
*** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области» отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество.*
**** Ограничения (обременения): аренда до 30.06.2022 г.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона:

по предметам торгов **№№ 1–3** в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;

по предмету торгов **№ 4** в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 23.06.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **23 июня 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 13.06.2022 по 21.06.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:**
(017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).
Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».




# «ПРАЗ ВЫСІ, ДАЛІНЫ, МАГІЛЫ ПА КВЕТКУ БЯГУЦЬ І БЯГУЦЬ!»

## Любімыя расліны Купалы і Коласа

**У кожнага пісьменніка і паэта сустракаюцца так званыя магістральныя вобразы — тыя, што ён, свядома ці несвядома, выкарыстоўвае часцей...**

У Янкі Купалы і Якуба Коласа таксама ёсць улюбёныя вобразы. У тым ліку расліныя. На пачатку лета, калі ўсё квітнее і буяе, давайце пройдземся па чароўным садзе, створаным уяўленнем нашых Песняроў, палюбуемся на тыя дрэвы, кусты, кветкі, якія найчасцей сустракаюцца ў іх творах... Некаторыя любілі яны абодва, некаторыя былі ўлюбёнцамі толькі аднаго з іх...

### Папараць-кветка

Гэтая дзівосная расліна — сімвал аднаго з Песняроў, а менавіта Янкі Купалы. Кветка, якая расцвітае толькі ў ноч на Івана Купалу — калі і нарадзіўся Іван Луцэвіч. Папараць-кветка дае таму, хто яе знойшоў, магчымасць разумець мову птушак і звяроў, бачыць скрозь зямлю скарбы... Але ж і спакушае людзей магчымасцю лёгка стаць багатым і моцным. У вершы «Заклятая кветка» Янка Купала перасцерагае:

*«Чуць толькі*
*Купальскае свята*
*Набліжыцца з ночкай*
*сваей,*
*Як папараць-кветкай*
*заклятай*
*Чаруе*
*няшчасных людзей...*

*З надзеяй, і верай,*
*і сілай*
*З усюль,*
*куды б дзе ні зірнуць,*
*Праз высі, даліны,*
*магілы*
*Па кветку*
*бягуць і бягуць!»*

Бягуць дурныя людзі, гінуць мільёнамі за тую прывідную расліну... У вершы «У Купальскую ноч» паэт зноў апісвае героя, які пакутліва шукае кветку-шчасце, а яго ўсё падманваюць, усё мучаюць злыя духі лесу...

*«Стой! Здаецца,*
*вунь зірнула,*
*Як бы зорка,*
*як бы сонца!*
*Ах, не тое! Адвярнула!..*
*Гэта шышка*
*на сасоны».*

Вось ужо як бы і знайшоў — але заспяваў певень, і кветка знікла. Верш вельмі ў духу сімвалізму, пошукаў чалавекам Сіняй птушкі, самаідэнтыфікацыі, сэнсу жыцця... Для Купалы папараць-кветка — гэта яшчэ і лёс Беларусі ўвогуле. Недарэмна заканчваецца твор крыкам: «Дайце кветку! Дайце сонца!»

### Каліна

Беларускія песні ўпадабалі кустоўе, што буяе ўвесну белым кветам, а ўлетку ягады яго крываваць чырвань... Абодва Песняры згадваюць гэты вобраз. У эпапеі Коласа



«На ростанях» пра каліну пяе Ядвіся:

*«Ядвіся адышла далей у куток каля кахлянай печы і заспявала:*

*«Ці я ў полі не калінаю была?..»*

*Голас у яе быў малады, свежы, сакавіты. Спявала яна з такім праўдзівым пачуццём, што рабіла вельмі добрае і прыемнае ўражанне.*

*Лабановіч слухаў гэтыя спевы, і нейкі жаль ахопліваў яго. Яму хацелася падысці да дзяўчыны і запытаць яе: «Скажыце, якое гора ў вас на сэрцы?»*

Ну а Янка Купала, натхніўшыся гэтым сімвалам дзявочай даткліваў красы, стварыў верш «Явар і каліна», які стаў новай беларускай песняй пра каханне, непадуладнае суровым выпрабаванням:

*«Песняй*
*вясны лебядзінаю,*
*Скінуўшы зімнія чары,*
*Шэпчуцца явар з калінаю*
*Ў сумнай даліне*
*над ярам».*

Успамінае каліну ён і ў паэме «Бандароўна», апісваючы гераіню:

*«І стаіць яна прад панам,*
*Як калінка тая,*
*Што у лузе, над ракою*
*Вецер пахіляе».*

### Дуб

Вось пра гэтае дрэва, калі цытаваць абодвух класікаў, і кнігі не хопіць... Нездарма ж Колас уласнаручна пасадзіў каля свайго дома, дзе цяпер музей, чатыры дубы і бярозу, як сімвалы сябе, трох сыноў і жонкі, а адзін з варыянтаў помніка Янку Купалу ўяўляў сабою курган, на вяршыні якога расце дуб... Зусім як у яго паэме «Курган»:

*«Дуб галлё распусціў*
*каранасты над ім,*
*Сухазелле у грудзі*
*ўпілося;*
*Вецер стогне*
*над ім уздыханнем*
*глухім, —*
*Аб мінуўшчыне*
*ў жальбах галосе».*

У прыпавесці Коласа «Дуб» гэтае дрэва апісанае з найвялікай пашанай: *«Адны толькі паважныя дубы, узбагачаныя вопытам жыцця за свой доўгі век, не вельмі спяшаліся расчыняць свае пакаўкі і выпускаць адтуль свежую зелень маладых лісточкаў, бо дуб — мудрае дрэва, і не паддаецца ён на зман няпэўнай у пачатку вясны».* У яго вершы з такой жа назвай

*«Сілачом стаіць*
*Дуб разложысты,*
*І здалёк відаць*
*Пышны верх яго».*

Гэта і сімвал гістарычнай памяці, і трывушчасці беларускага народа.

*«Налятаў віхор*
*З навальніцаю,*
*Ды не гнуўся ты*
*Перад бураю!..»*

А вось у прыпавесці «Як птушкі дуб лячылі», напісанай у 1955 годзе, калі Колас часта хварэў, можна ўгледзець атаясамленне аўтара сябе са старым дубам, якога ледзь не залячылі занадта клапатлівыя птушкі, не даючы дыхаць вольным паветрам.

Максім Лужанін успамінаў, як з сябрамі наведваў Коласа ў 1944 годзе ў падмаскоўным санаторыі Вузкае, і паэт павёў пасля ўсіх у парк, дзе прадставіў... мясцовым дубам:

*«Так Колас пазнаёміў нас з дубамі, пазнаёміў літаральна, бо кожнае дрэва мела чалавечае імя. Канстанцін Міхайлавіч ахрысціў іх так трапна, што, калі называў чарговае імя, здавалася, перад намі не дуб, а сапраўдны Рыгор, вясковы дзядзька ў лапціках і шапцы-аблавушцы. Наймагутнейшы і найстарэйшы ў гэтай сям'і называўся Сымон-дзядзя. Ён замацаваўся на жыццё ў Коласавым вершы «Вузкае». Падставы для пашаны і далікатнага абыходжання з дрэвам, безумоўна, былі. Мы паспрабавалі абняць Сымона: не стала рук. Да нас далучыўся Канстанцін Міхайлавіч. Ён пачаў клікаць у гурт і Марыю Дзмітраўну.*

*— Хопіць і вас, самі добрыя дубы, — пасміхнулася яна».*

### Груша

А вось гэтае дрэўца — улюбёнка менавіта Якуба Коласа. У трылогіі «На ростанях» з дзікай ігрушкай асацыіруе настаўнік Лабановіч каханую Ядвісю. Нават знаходзіць у лесе маладую грушку, каб пасадзіць яе на памяць пра дзяўчыну.

Цікава, што Ядвіся сапраўды атаясаміла дрэўца з сабою.

*«Яна доўга разглядала яе. Потым засмяялася і сказала:*

*— Я вырву яе і выкіну.*

*— Чаму?*

*— Бо яна такая ж калючая і дзікая, як я».*

А калі Ядвісі павінна ад'ехаць, няшчасная ад таго, што, не папярэдзіўшы, пакіне Лабановіча, ідзе да грушкі:

*«Яна аглядаецца, бярэцца за дрэўца. Але грушка моцна бароніць сябе і коле Ядвісі руку.*

*«Гэта ж я такая калючая, — думае Ядвіся, — бо я — дзікая!»*

*Яна зноў падымае руку, асцярожненька бярэ за самы вяршок і ломіць яго. Нашто яна гэта зрабіла? Яна проста хоча сказаць гэтым, што яна злая і нядобрая. Няхай ён ведае гэта».*

Якуб Колас распавядаў Максіму Лужаніну, як нарадзіўся адзін яго верш:

*«— З ігрушамі была яшчэ адна фацэцыя. Помніш мае «Грушы-сапяжанкі»? Гэтак амаль і адбывалася са мною і з братам Алесем. На ласткоўскай сядзібе расло некалькі груш. Мы з Алесем пасвілі авечкі недалёка ад хаты. Дзядзька Пятрусь гупаў цэпам у гумне. Алесь падвучыў мяне, і я палез у грушы. Дзядзька згледзеў, давялося ўцякаць.*

*Мы з авечкамі адагналіся далей ад дому, каб паказаць, што нас блізка няма. Цяпер цішком падаўся на раздабыткі Алесь. Узлез на ігрушу,налупіў запазуху, а тут — дзядзька! Алесь — наўцёкі, дзядзька за ім. Пакуль Алесь бег, усе ігрушы пагубляў. Так мы і не паласаваліся. А дзядзькі доўга пасмейваліся: «А што, смачныя грушкі?»*

### Вярба

У беларускім фальклоры гэтае дрэўца ўспрымаецца як сімвал тугі і самоты, горкай жаночай долі. Для Янкі Купалы — найлепшы сродак стварыць гатычны пейзаж:

*«Стаіць вярба сухая*
*У полі на мяжы,*
*Кару з галін спіхае,*
*Галіны — як крыжы».*

Верш напісаны ў 1911 годзе, калі Янка Купала жыў і вучыўся ў Санкт-Пецярбургу, дзе якраз расцвітаў сімвалізм у мастацтве.

У вершы «Вярба» Якуба Коласа гэтае дрэўца таксама невясёлае:

*«Пытаў ручаёчак*
*Сірату-вярбіну,*
*Што над ім стаяла,*
*Знізіўшы галіны,*
*Да вады галоўку*
*Звесіўшы самотна,*
*Ды з паўднёвым ветрам*
*Зюкала журботна...»*

Ручаёк пытаецца, чаго ж вербачка над ім такая пахілая ды журботная — аказалася, гэта таму, што ручаёк падмывае яе карэнне, і «нашто я цябе любіла», карацей.

### Бяроза

Вядома, ні Купала, ні Колас не маглі не згадваць у сваіх творах бярозу... Праўда, вельмі па-рознаму.

*«Расце бяроза серад поля,*
*Ўдалі ад лесу, сіратой;*
*Жыве пясняр*
*з сваёй нядоляй,*
*З сваёй маркотнаю душой.*
*Ваюе з бурамі бяроза,*
*Мароз, слата сячэ яе;*
*Пясняр з няпраўдай*
*б'ецца ў слёзах,*
*За ўсіх цярпіць,*
*для ўсіх пяе».*

Так Янка Купала ў вершы «Дзве долі» параляліць лёс бярозы з лёсам паэта. У другім вершы, які стаў песняй, бяроза выглядае яшчэ жаласней:

*«Шумныя бярозы*
*Пабяліў мароз.*
*Хацеў бы я плакаць,*
*Дый не маю слёз».*

У Якуба Коласа вобраз той жа, настрой іншы:

*«Надышлі марозы,*
*Рэчкі закавалі,*
*Белыя бярозы*
*Шэранем убралі».*

Ну і тое, што Колас пасадзіў ля свайго дому бярозку ў памяць пра жонку Марыю Дзмітраўну, таксама кажа пра ягонае светлае ўспрыняцце гэтага дрэўца.

### Лілея

Не так шмат у Песняроў згадак пра асобныя кветкі, хоць Колас ладзіў дзялянкі ля свайго дома — але вырошчваў жыта і ячмень, а Купала, па сведчаннях, дужа любіў ружы — меў пры доме разарый, дзе расла нават рэдкая чорная ружа. Найчасцей у творах абодвух згадваюцца кветкі ўвогуле...

Але ёсць у Янкі Купалы цікавы верш «Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея». Праўда, зусім ён не пяшчотны, як, здавалася б, вымагае вобраз... Наадварот, баявіты:

*«Гэй ты, дзяўчына,*
*кветка-лілея,*
*Вольная птушка*
*сумнай зямліцы!*
*Сееш ты слёзы,*
*думак уроду,*
*Слёзы-брыльянты*
*яснай крыніцы».*

Верш напісаны ў 1914 годзе і прысвечаны ён Уладзіславе Станкевіч, якая ў 1916-м стане жонкай паэта. Уладзіслава Францаўна была сапраўды дзяўчынай баявітай, актыўнай беларускай дзяячкай.

З лілеяй параўноўвае Янка Купала і іншую сваю баявітую гераіню, Бандароўну, якая ўцякае ад злога пана і робіцца сімвалам змагання:

*«Як маліны, яе губкі,*
*А твар, як лілея,*
*Як дзве зоркі, яе вочы,*
*Гляне — свет яснее».*

### Сосны

Ну як жа беларускі лес без сасны! Як пісаў Колас на пачатку «Новай зямлі»,

*«Вось як цяпер,*
*перада мною*
*Ўстае куточак той*
*прыгожа,*
*Крынічкі вузенькая ложа*
*І елка ў пары з хваіною,*
*Абняўшысь цесна*
*над вадою,*
*Як маладыя ў час кахання,*
*Ў апошні вечар*
*расставання».*

Хоць сосны тыя не толькі ў лесе — ля дома Коласа ў Мінску таксама раслі, Лужанін згадваў, як пісьменнік злаваў на гракоў, што сяліліся на «прыхатніх соснах»: «ломяць, бачыце, галлё, а дрэвы праз гэта ўсыхаюць».

А Янка Купала напісаў усхваленне соснам Карэліі:

*«Сосны выносныя,*
*Гордыя сосны!*
*Шмат вы ўжо носіце*
*Сонечных вёснаў».*

Хвоі ў абодвух паэтаў не проста дрэвы — яны ўмеюць слухаць і гаманіць, і ўжо куды больш чулыя, чым людзі.

*«А елкі хмурымі крыжамі*
*Высока ў небе*
*выдзяляліcь,*
*Таемна з хвоямі*
*шапталісь».*

### Ліпа

Да ліпы паэты адносіліся паважліва. Светлае дрэва, меданоснае.

*«Высока, разлажыста*
*Расселася пры хаце*
*Стара-старая ліпа,*
*Паважная, як сваццяя», —*
піша Купала.

У ягоным жа вершы «Забытая скрыпка» менавіта з ліпы зроблены інструмент, здольны абудзіць сэрцы:

*«Льюцца песнярскія словы,*
*З дошкай ліповай пяюць;*
*Звесіўшы людзі галовы,*
*Слухаюць, думкі снуюць».*

У вершы «Лірнік вясковы», прысвечаным Сыракомлю, герой гадуецца ў ліпавай калысцы. А ў паэме «Нікому» на магіле гераіні вырастаюць ліпа і клён, у знак, што закаханыя з'ядналіся і пасля смерці.

Сваю прыпавесць «Даль» Якуб Колас пачынае так:

*«Зацвіла прыгожая ліпа. Колькі шуму было тут на гэты час, колькі рознагалосага спеву! Працавітыя пчолкі, усялякія мушкі гулі так, што здавалася, нібы ліпа — гэта нейкі дзіўны музыкальны інструмент, і тут адбываецца ігрышча».*

А потым насенне ліпы захацела паляцець далёка, у сінюю даль... Старой ліпе шкада было пускаць дзіця ў чужы свет, але блаславіла. Паляцела маладое насенне з ветрам, глядзіць на родную зямлю: *«няўжо гэта тыя самыя малюнкі, на якія глядзела яно так нядаўна? А дзе ж іх хараство? Дзе тыя абрысы, дзе грабяні, што так павабна выглядалі адтуль — з ліпы?»*

Занепакоілася насенне, ці туды яно ляціць, дзе ж тая прывабная сіняя далеч?

Каб зразумець прыпавесць, варта паглядзець на год напісання: 1917. Год вялікіх перамен і вялікіх надзей.

Спадзяюся, кожны з вас захоча знайсці расліны з дрэва гэтага віртуальнага саду на старонках класікаў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ШАШЛЫК ЯК АСАБЛІВЫ ВІД МАСТАЦТВА

## Запыталіся ў кухараў аб правілах ідэальнага прыгатавання

**Калі вы яшчэ не выбраліся на шашлыкі, значыць, лета для вас не пачалося. Шашлык — любімая, галоўная і, па сутнасці, адзіная страва для пікніка ў нашых шыротах. Штогод з прыходам цяпла амаль каля ўсіх вадаёмаў і ў лесапаркавых зонах краіны, дзе ўсталяваны мангалы, альтанкі і пляцоўкі для вогнішча, можна адчуць апетытныя пахі смажанага мяса і пабачыць стыхійны «конкурс кулінарных шэдэўраў».**

Радзіма шашлыка, дарэчы, не толькі Паўночны Каўказ, але і Лівія, Іран, Ірак, іншымі словамі — міжнародная страва. У каноны гатавання якой унеслі (і актыўна ўносяць) свой уклад кулінарныя культуры многіх краін. У тым ліку і беларусы. А наогул, гістарычна шашлык беларусам не чужы: гэта адна з тых страў, аналаг якіх ёсць практычна ва ўсіх народаў (як, напрыклад, тыя ж пельмені або бліны). Быў свой «варыянт шашлыка» і ў старабеларускай кухні. Аказваецца, у нашых продкаў была страва «мяса на ражне»: доўгі металічны прут, ражон, выкарыстоўваўся так жа, як шампуры на Каўказе. На яго нанізваліся кавалкі птушкі або мяса і смажыліся на вуглях. Папярэдне мяса марынавалі, у якасці марынаду выкарыстоўвалася сумесь кмену, зеляніны і здробненага хрэну.



Такім чынам, збіраемся на шашлыкі. І пачнём з выбару мяса. Тут кухары даюць дакладныя рэкамендацыі: для стэйка, грыля і шашлыку свежасць мяса асабліва важная, бо галоўная каштоўнасць гэтых страў у тым, што яны дазваляюць адчуць чысты, сапраўдны смак мяса. Калі гаворка пра свініну, для шашлыку падыдуць шыя, выразка або паляндвічная частка, а таксама кумпяк — пры правільнай падрыхтоўцы. Для шашлыку з ялавічыны патрэбныя паляндвічная частка або выразка, а калі рабіць шашлык з бараніны, выбіраем кумпяк або таксама паляндвічную частку.

Курыца — другі па папулярнасці пасля свініны від шашлыку ў нашага насельніцтва. А апошнім часам, мабыць, і першы (курыны шашлык абыдзецца танней за ўсе астатнія варыянты). Часткі курынай тушкі падыдуць любыя — гэта справа густу, а далікатнае курынае мяса ў любым выпадку хутка замарынуецца. Для шашлыку выкарыстоўваюць (калі складаць рэйтынг папулярнасці) сцёгны (іх можна падзяліць напалову, а можна не дзяліць — калі вуглёў шмат), крыльцы (маментальна гатуюцца і смачна храбусцяць), грудку (хоць яна можа быць сухаватая) і ножкі. Але прафесійныя кухары неадназначна ставяцца да курынага шашлыку.

Не будзем падрабязна спыняцца на важнасці правільнай нарэзкі мяса: тое, што мяса на шашлык рэжаць толькі папярок валокнаў, інакш пры смажанні яно страціць увесь сок і будзе жорсткім, напэўна, усім вядома.

**«Просты рэцэпт соусу да шашлыку — памідоры апарыць кіпнем, зняць скурку, дадаць часнок, кінзу, чырвоны перац і злёгку ўзбіць блэндэрам. Пасля гэтага ўліць трохі аліўкавага алею. Вельмі важны і выбар спецый. Гэта каляндра, лаўровы ліст (яго трэба растаўчы), мускатны арэх. Часам нават можна дадаць адну штучку гваздзікі або крышачку карыцы».**

Але шашлык — гэта не проста смажанае на вуглях мяса, парэзанае буйнымі кавалкамі. Гэта свайго роду рытуал, і пачынаецца ён з марынавання мяса напярэдадні паездкі. І тут адкрываецца велізарны прастор для творчасці: у многіх сем'ях ёсць свой фірменны рэцэпт марынаду. Пра тое, як правільна марынаваць мяса і гатаваць самую народную страву для паездкі на прыроду, вызначаем з кухарамі.



**«Для стэйка, грыля і шашлыку свежасць мяса асабліва важная, бо галоўная каштоўнасць гэтых страў у тым, што яны дазваляюць адчуць чысты, сапраўдны смак мяса. Калі гаворка пра свініну, для шашлыку падыдуць шыя, выразка або паляндвічная частка, а таксама кумпяк — пры правільнай падрыхтоўцы. Для шашлыку з ялавічыны патрэбныя паляндвічная частка або выразка, а калі рабіць шашлык з бараніны, выбіраем кумпяк або таксама паляндвічную частку».**

### «НЕ РАЮ ПСАВАЦЬ СМАК МЯСА КЕТЧУПАМ»

***Аляксандр Чыкілеўскі, кіраўнік Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі:***

— Я катэгарычна супраць марынавання ў воцаце: мяса становіцца кіслым. Супраць і марынавання ў маянэзе — па-першае, маянэз таксама забівае смак мяса, па-другое, пры высокай тэмпературы над вогнішчам ён тут жа становіцца чорным, ператвараючыся ў канцэраген. Для мяне ідэальны варыянт марынавання мяса — той, які выкарыстоўваецца на Каўказе. Бярэцца цыбуля (у прапорцыі адзін да аднаго), кінза (зеляніна проста рвецца рукамі) і зіра. Марынуюць у гэтай сумесі мяса ўсю ноч, без солі і перцу. Соль выцягвае з мяса вадкасць, а так сок застаецца ўнутры. А чорны перац пад уздзеяннем высокай тэмпературы надае мясу горыч — многія яе не чуюць, але я адчуваю гэты горкі прысмак вельмі добра, і ў шашлыку ён недарэчны.

*— Няўжо на Каўказе шашлык ядуць прэсным?*

— Каб кампенсаваць адсутнасць солі, да гатовага шашлыку на Каўказе падаюць рэзкія соусы з травамі. У Грузіі яшчэ любяць есці шашлык з кісламалочным прадуктам мацоні. Сакавітае мяса мачаюць у рэзкі салёны і востры соус — гэта вельмі смачна. А ўсё тое, што ў нас прынята марынаваць у воцаце, маянэзе і незразумелых, набытых у краме запраўках, не шашлык.

*— Часам шашлык марынуюць у апельсінавым соку...*

— Або ў лаймавым. Апельсінавы сок варта трохі развесці вадой, а лаймавы можна развесці белым віном.

*— А калі замарынаваць шашлык у віне?*

— Можна. Але ў белым, а не ў чырвоным, бо ў чырвоным больш танінаў, і смак мяса страціцца. Цалкам магчыма і піва ў якасці марынаду. Можна дадаць у марынад не толькі цыбулю, але і часнок — яго лепш нарэзаць не дробна, а досыць брутальна. Што датычыцца спецый для шашлыку, тут ёсць шмат варыянтаў. Для мяне аптымальныя зіра, кінза, каляндра, па асобнасці або разам. Яны нададуць страве цікавы смак з усходнімі ноткамі.

*— Кетчуп, напэўна, лепш не выкарыстоўваць у якасці соусу?*

— Не раіў бы псаваць смак мяса кетчупам! Просты і хуткі таматны соус нескладана прыгатаваць самастойна. Пракручваем у мясарубцы памідоры, соль, цукар, часнок, чырвоны перац і рэзкія травы. Да шашлыку такі соус — гэта бомба!

### «МАРЫНАВАЦЬ ЛЕПШ У НАТУРАЛЬНАЙ ЗЕЛЯНІНЕ»

***Валерый Еранкевіч, кухар з 43-гадовым стажам:***

— Тое, што прынята называць шашлыком у нас, часцей за ўсё проста смажанае мяса. Шашлык гатуецца па-іншаму. Марынаваць мяса на шашлык варта толькі ў натуральнай зеляніне. Мне падабаецца сумесь «пятрушка-кроп-цыбуля». Наразаем, пераціраем мяса з гэтай сумессю і марынуем. Я дадаю соль, але толькі ў самым канцы марынавання.

*— Колькі трэба часу, каб мяса прамарынавалася ў гэтай сумесі?*

— Залежыць ад мяса і ад тэмпературы паветра. Калі, дапусцім, мы гаворым пра свіную шыю, дастаткова трох-чатырох гадзін пры тэмпературы +20 градусаў, у халадзільніку — сямі гадзін. Калі выразка або паляндвіца, часу для марынавання спатрэбіцца менш. Я звычайна раблю так: дамовіліся паехаць на шашлыкі, я раніцай устаю і марыную мяса. Пераціраю яго з зелянінай, дадаю мускатны арэх, хмелі-сунелі, чорны і чырвоны перац. Крыху пазней, за дзве гадзіны непасрэдна да смажання, — цыбулю. Некаторыя кухары прапускаюць яе праз мясарубку. А можна і проста парэзаць.

**Шашлык — гэта не проста смажанае на вуглях мяса, парэзанае буйнымі кавалкамі. Гэта свайго роду рытуал, і пачынаецца ён з марынавання мяса напярэдадні паездкі.**

*— Што галоўнае для правільнага шашлыку?*

— Галоўнае — правільнае мяса. Смачны шашлык атрымаецца толькі з вельмі свежага, якаснага мяса — ад знаёмага прадаўца з базару або ад фермера. І яшчэ для шашлыку галоўнае — соус. Не кетчуп і ўжо дакладна не соус на аснове крамнага маянэзу. Маянэз прамысловай вытворчасці я наогул раіў бы хоць бы летам выключыць з рацыёну. Ды і зімой лепш рабіце яго самастойна, дамашні. Просты рэцэпт соусу да шашлыку — памідоры апарыць кіпнем, зняць скурку, дадаць часнок, кінзу, чырвоны перац і злёгку ўзбіць блэндэрам. Пасля гэтага ўліць трохі аліўкавага алею. Вельмі важны і выбар спецый. Гэта каляндра, лаўровы ліст (яго трэба растаўчы), мускатны арэх. Часам нават можна дадаць адну штучку гваздзікі або крышачку карыцы. Некаторыя дадаюць да шашлыку лімонны сок. Гэта калі мяса ўжо гатовае і хвілін за дзесяць да падачы можна злёгку апырскаць яго лімонам.

*— А хіба шашлык ядуць не адразу «з пылу з жару»?*

— Гэта залежыць ад гарніру. Калі ў яго якасці ў вас гародніна, тады лепш, каб мяса крыху астыла. А ў Арменіі, напрыклад, шашлык спалучаюць з лавашом (не пухнатым, а тонкім, ліставым) — у гэтым выпадку мяса прынята падаваць акурат з агню. А вось з нашым класічным чорным хлебам шашлык есці не трэба: гэтыя два прадукты не спалучаюцца.

### «ТУТ НЯМА «ПРАВІЛЬНА» І «НЯПРАВІЛЬНА»

***Павел Дзям'янка, кухар, саўладальнік кампаніі па дастаўцы правільнага харчавання:***

— Калі гаворка ідзе аб свініне, правільней за ўсё, на мой погляд, марынаваць мяса ў сумесі «цыбуля-соль-перац». Сок цыбулі сам па сабе — выдатны марынад. Можна парэзаць цыбулю кольцамі, калі так больш звыкла. А можна здрабніць яе ў блэндары да стану кашыцы. Суадносіны цыбулі і мяса бярыце «на вока». А наогул, калі гаворка ідзе аб шашлыку, мабыць, у прынцыпе няма «правільна» і «няправільна». Тут кожны сам сабе шэф-кухар. Але ж выкарыстоўваць адзін і той жа марынад з году ў год, таму што «у нашай сям'і заўсёды так марынуюць мяса на шашлык» — нецікава. Варта спрабаваць новыя варыянты, проста каб выбраць, што больш спадабаецца.

*— Курыцу таксама рэкамендуеце марынаваць у сумесі цыбулі, солі і перцу?*

— Не, у гэтым выпадку шашлык будзе сухаваты. Каб замарынаваць курыцу, цыбулю можна парэзаць кольцамі, соль і перац дадаём па смаку і можна выкарыстаць, напрыклад, ёгурт без напаўняльніка. Асабіста мне падабаецца такі спосаб: шашлык атрымліваецца вельмі далікатны. Пра тое, як «правільна саліць» шашлык, выразных рэкамендацый не дам: на мой погляд, тут усё вельмі індывідуальна. На Каўказе, сапраўды, наогул не выкарыстоўваюць соль пры яго падрыхтоўцы. Часам, праўда, мяса соляць пры падачы, калі яно ўжо гатова.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80. УНП 500154362** |

**Предмет аукциона (одним лотом) – помещения административного корпуса 25.**
**Адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80**

| Наименование (назначение), инвентарный номер | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Административное помещение** | 30,5 кв. м | 443/D-11064 |
| **Административное помещение** (1-й–2-й этажи) | 1675,5 кв. м | 443/D-11065 |
| **Административное помещение** (1-й–2-й этажи и подвал) | 777,9 кв. м | 443/D-11066 |
